ШТОТЫДНЁВАЯ ГАЗЕТА ДЛЯ СУАЙЧЫННІКАЎ ЗА МЕЖАМІ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

Голас Радзімы

№ 18 (2472) 2 мая 1996 г.

Выдаецца з 1955 г. Цана 1000 рублёў.

РАДАЎНІЦА: КУРАПАТЫ БЕЗ ПАЛІТЫКІ





Памятаю, як летась на Радаўніцу калоны пад бел-чырвона-белымі сцягамі валілі ў Курапаты. Было людна...

Сёлета не відаць было ў Курапатах аніякіх сцягоў. Памянуць загубленыя тут душы сабраліся дзесяткі, ну ад сілы -- пару соцень чалавек. Мо таму і працялі свядомасць словы пробашча касцёла святых Сымона і Алены Уладзіслава Завальнюка: "Паглядзіце, колькі сёння тут нас. Скончылася палітыка ў Курапатах. І цяпер Курапаты больш нікому не патрэбны. Але калі чалавека пакідаюць усе, застаецца адна маці. Маці-вера застаецца з намі. І яна найбольш патрэбна тым, хто ў гэтай зямлі".

Сумна і балюча, што Курапаты дагэтуль застаюцца месцам адпачынку гараджан, выгулу сабак і звычайнага п'янства. А тым жа, чые косці ў гэтай зямлі, праз каго б ні былі яны памардаваныя, патрэбна наша малітва і наша памяць.

Ян ГІЛУЦЁВІЧ.

НА ЗДЫМКАХ: Курапаты. Радаўніца. 1996 год.

Фота Віктара СТАВЕРА.



"БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ НЕ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ВЫНІКАМ НЕДАСТАТКОВАЙ УВАГІ ЗАХАДУ ДА ПРАБЛЕМ БЕЛАРУСІ"

З МІНІСТРАМ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ БЕЛАРУСІ УЛАДЗІМІРАМ СЯНЬКО ГУТАРЫЦЬ КАРЭСПАНДЭНТ "ІНТЭРФАКСА" ВЯЧАСЛАЎ ЗЯНЬКОВІЧ

-- Уладзімір Лявонавіч! Існуе думка, што падпісанне дагавора аб беларуска-расійскім супольніцтве з'яўляецца вынікам недастатковай увагі Захаду да рэспублік былога СССР і, у прыватнасці, Беларусі, [illegible]ертнасць Захаду, які пр[illegible] як мець справу толькі з Расіяй і недаацэньвае значнасць новых незалежных дзяржаў, прывяла да таго, што Беларусь перастала спадзявацца на дапамогу Захаду ў развіцці нацыянальнай эканомікі і вымушана была добраахвотна пайсці на інтэграцыю з Расіяй. Наколькі абгрунтаваны, на ваш погляд, такі пункт погляду!

-- Падпісанне дагавора аб беларуска-расійскім супольніцтве з'яўляецца лагічным увасабленнем вялізных, я сказаў бы, нястрымных мэтанакіраваных намаганняў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі па ажыццяўленню спадзяванняў большасці насельніцтва рэспублікі -- паглыблення інтэграцыйных працэсаў з Расіяй.

Нікольні не абсалютызую, але і не магу недаацэньваць вынікі майскага 1995 года рэферэндуму, калі большасць народа выказалася ў падтрымку праводзімага Прэзідэнтам рэспублікі курсу на беларуска-расійскую інтэграцыю.

Было б яўна неправамерным лічыць інтэграцыйны курс Мінска вытворнай недастатковай дапамогі Захаду. Сапраўды, гэтае садзейнічанне пакуль нязначнае, нягледзячы на прымаемыя беларускім бокам намаганні. Беларусь адкрыта і паслядоўна выступае за інтэнсіўнае, дынамічнае супрацоўніцтва з ЗША, дзяржавамі Заходняй Еўропы. Пацвярджэннем таму служаць падпісанне нядаўна часовага пагаднення з Еўрапейскім саюзам аб гандлі, актыўныя крокі рэспублікі па хутчэйшаму ўступленню ў Савет Еўропы, удзел Беларусі ў праграме "Партнёрства дзеля міру", мэтанакіраваная дзейнасць па развіццю двухбаковых сувязей з рознымі дзяржавамі свету.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

У АДКАЗ НА ЛІСТ СЯБРОЎКІ

НАША СЁННЯ

Днямі я атрымала ліст з Польшчы ад маёй сяброўкі Марыі Путрамант. Марыя Путрамант — дачка вядомага польскага пісьменніка Ежы Путраманта, аўтара раманаў "Верасень", "Раздарожжа", "Пасынкі", "Болдзін" і іншых твораў. Сама пані Марыя -- журналістка, шмат пісала краязнаўчых, літаратуразнаўчых артыкулаў, перакладала з рускай, беларускай моў. Яе пяру належыць нямала артыкулаў пра Беларусь, перакладаў твораў беларускіх пісьменнікаў. Мы некалькі разоў сустракаліся з Марыяй Путрамант -- і ў Варшаве, і ў Мінску, перапісваліся. Але апошнім часам, у сувязі з новымі варункамі нашага жыцця, перапіска, можна сказаць, спынілася. І раптам -- пісьмо. Пані Марыя прачытала ў газеце "Голас Радзімы" мой артыкул, прысвечаны стагоддзю з дня нараджэння Кандрата Крапівы. Гэта і падштурхнула яе пяро. Пані Марыя пісала мне:

"Апошнія гады ў Варшаве няма беларускай прэсы, няма "тоўстых" часопісаў. У мінулым годзе на травеньскім кніжным кірмашы ў Варшаве ў беларускім аддзеле былі галоўным чынам пераклады з заходніх моў і альбомы. Таму кожны нумар "Голасу Радзімы" я чытаю ад пачатку да канца". І далей:

"Хацелася б даведацца, што цяпер у Мінску выдаецца, пра новыя імёны. Цяпер няма цэнзуры і могуць выходзіць добрыя кніжкі...

(Заканчэнне на 6-й стар.).

ПАДЗЕІ ЛЮДЗІ ФАКТЫ ПАДЗЕІ ЛЮДЗІ ФАКТЫ ПАДЗЕІ ЛЮДЗІ ФАКТЫ

АФІЦЫЙНАЯ ХРОНІКА





20 красавіка напярэдадні дзесяцігоддзя катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка сустрэўся ў Мінску з жыхарамі мікрараёна "Малінаўка" -- перасяленцамі з чарнобыльскай зоны.

НА ЗДЫМКАХ: Алясандр ЛУКАШЭНКА віншуе маладажонаў -- Аксану КАЗЛОВУ, былую жыхарку пасёлка Карма Гомельскай вобласці, а цяпер настаўніцу школы N 208, і Дзмітрыя КАРАЦЕНКУ, слесара "Белэнергарэмналадка"; сустрэча ў Малінаўцы.

ЗАЯВА МЗС

ПАЗНЯК ПСУЕ НАДВОР'Е

Міністэрства замежных спраў Беларусі зрабіла заяву ў сувязі з публічнымі выступленнямі лідэра БНФ Зянона Пазняка ў шэрагу еўрапейскіх дзяржаў. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў аддзеле друку і інфармацыі МЗС рэспублікі.

У ёй, у прыватнасці, адзначаецца, што МЗС рэспублікі ўважліва сочыць за развіццём падзей, звязаных са знаходжаннем З.Пазняка ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Рэспубліка Беларусь, з'яўляючыся ўдзельніцай усіх асноўных міжнародных дагавораў у галіне правоў чалавека, безумоўна, прызнае права асобы на свабоднае выказванне сваіх поглядаў, уключаючы сваб[illegible] распаўсюджваць розную інфармацыю. Разам [illegible]ым у адпаведнасці з міжнародным правам карыстанне гэтымі свабодамі накладае і асаблівую адказнасць за аб'ектыўнасць распаўсюджваемых звестак, звязана з неабходнасцю паважаць правы і рэпутацыю іншых асоб, улічваць інтарэсы бяспекі дзяржавы.

"Шэраг заяў З.Пазняка ў час яго публі[illegible] выступленняў у Кіеве, Празе, Вроцлаве маюць яўна паклёпніцкі характар, змяшчаюць выдуманыя і зняважлівыя выказванні ў адрас вышэйшых службовых асоб Рэспублікі Беларусь, з'яўляюцца спробай у скажоным святле падаць унутрыпалітычную абстаноўку ў краіне. Асаблівую заклапочанасць беларускага боку выклікаюць кантакты з лідэрам БНФ афіцыйных асоб некаторых дзяржаў, што можа быць расцэнена як ускосная падтрымка сіл, якія ставяць сабе за мэту дэстабілізацыю сітуацыі ў Беларусі і страчваюць з-за гэтага свой палітычны ўплыў", -- гаворыцца ў заяве.

У сувязі з гэтым Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь упаўнаважана заявіць, што такія дзеянні афіцыйных колаў іншых дзяржаў могуць нанесці ўрон дружалюбным двухбаковым адносінам, будуць расцэньвацца беларускім бокам як не адпаведныя агульнапрынятым прынцыпам і нормам міжнароднага права, узаемнай павагі і неўмяшання ва ўнутраныя справы адна адной.

МАГІСТРЫ АД ЭКАНОМІКІ



Абарона дыпломаў з прысваеннем акадэмічнай ступені магістраў эканомікі адбылася ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце.

Упершыню ў рэспубліцы 16 дыпламаваных спецыялістаў, якія прайшлі двухгадовы курс абучэння, надзелі мантыі магістраў. Яны будуць займацца знешнеэканамічнай дзейнасцю, фінансавым менеджментам і банкаўскай справай.

НА ЗДЫМКУ: дыплом магістра эканомікі ўручаецца Валерыю ГАЕЎСКАМУ.

ЛІСТ ДА ПРЭЗІДЭНТА

ПАТРАБУЮЦЬ ЖЫЛЛЁ І ГРАМАДЗЯНСТВА

Адкрытае пісьмо Прэзідэнту, спікеру парламента і прэм'ер-міністру рэспублікі накіравалі члены Саюза афіцэраў Мінска.

У пісьме, у прыватнасці, гаворыцца, што афіцэры, якія выканалі свой абавязак і звольнены ў запас (адстаўку), згодна з існуючым у рэспубліцы заканадаўствам маюць права на атрыманне жылля ў першачарговым парадку. Аднак у Мінску не забяспечаны кватэрамі больш як дзве тысячы сем'яў. У 1995 годзе ўпраўленне камунальнага будаўніцтва Мінгарвыканкома накіравала 35,8 мільяр[illegible]ублёў на будаўніцтва 110 кватэр, але ніводна[illegible]тэры афіцэры запасу не атрымалі.

Многія афіцэры прыбылі ў Мінск пасля кастрычніка 1991 года і не маюць беларускага грамадзянства. Вось чаму ў сваім пасланні экс-ваенныя патрабавалі не толькі прафінансаваць будаўніцтва 1 85[illegible] кватэр у 1996 годзе, але і ўнесці дапаўненне ў [illegible]эн аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь.

"Мая думка адназначная: дагавор -- дабро. І тыя, хто сее ў грамадстве смуту, карыстаючыся недастойнымі метадамі, грэбуе выбарам свайго народа.

Вядома, усе разважныя людзі разумеюць, што вярнуць мінулае немагчыма, ды і не трэба. Я ў поўнай меры на сабе зведала сістэму жорсткай цэнтралізацыі, калі даводзілася ўзгадняць кошт школьнага месца, тытульныя спісы на будаўніцтва, калі без дазволу цэнтра нельга было адкрыць новы тэатр, новае выдавецтва, газету і часопіс. Даводзілася знаходзіць усялякія хітрыя абходныя шляхі, абіваць парогі высокіх кабінетаў, выпрошваць сваё ж. Але будавалі таму, што заўсёды знаходзілі падтрымку і добразычлівыя адносіны да рэспублікі ў Маскве.

Я добра разумею, як перашкаджала цэнтралізацыя, але я ведаю і тое, што значыў наш Саюз для духоўных, культурных зносін. Ведаю, з якім сумам успамінаюць многія нашы дзеячы культуры аб той вялікай і ўсхваляванай аўдыторыі, якая сустракала нашых артыстаў ва ўсіх рэспубліках былога Саюза. Пісьменнікі ўспамінаюць вялікія тыражы, якімі выходзілі іх кнігі ў перакладах на многія мовы. Цяпер жа ў нашых выдавецтвах тыражы кніг нават самых вядомых празаікаў знізіліся да смехатворнай планкі — у некалькі тысяч экземпляраў, не кажучы ўжо аб паэтычных зборніках. Я лічу, што тыя, хто не разумее важнасці аднаўлення сувязей з усімі нашымі сябрамі па былому Саюзу, недальнабачныя людзі і недальнабачныя палітыкі".

Ніна СНЯЖКОВА,
дзяржаўны дзеяч БССР.

ТЭХНІЧНАЯ ДАПАМОГА

АД УРАДА ЗША

У самы бліжэйшы час Упраўленне знешнеэканамічнай дзейнасці і міжнароднага супрацоўніцтва Кабінета Міністраў рэспублікі будзе аснашчана самым сучасным абсталяваннем і камп'ютэрнай сеткай. Пастаўку тэхнічных сродкаў і распрацоўку камп'ютэрнай сеткі фінансуе ўрад ЗША. Аб гэтым паведамілі ў амерыканскім пасольстве ў Беларусі.

Мемарандум па пытанню аказання амерыканскім бокам тэхнічнай дапамогі беларускаму ўраду быў падпісаны віцэ-прэм'ерам рэспублікі Леанідам Сініцыным і Часовым Паверaным у справах ЗША ў Беларусі Джонам Борысам.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

ПАСТАНОВАЙ Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь у сувязі з 10-годдзем аварыі на Чарнобыльскай АЭС 26 красавіка 1996 года абвешчана Днём чарнобыльскай трагедыі, агульнанацыянальным днём смутку.

ЦЯГНІК "Надзея-Экспрэс" 25 сакавіка адправіўся ад мінскага вакзала ў трохдзённы маршрут. Ён прайшоў праз Магілёў, Гомель, Калінкавічы, Лунінец і вярнуўся ў сталіцу. Поезд даставіў у пацярпелыя ад радыяцыі раёны груз гуманітарнай дапамогі з краін Захаду.

БОЛЬШ за 600 жыхароў Хойніцкага раёна пасля чарнобыльскай катастрофы перасяліліся ў Верхнядзвінскі раён Віцебскай вобласці. Напярэдадні 10-й гадавіны аварыі на ЧАЭС яны наважыліся наведаць родныя мясціны. Разам з імі ў гэтай акцыі прынялі ўдзел улады Верхнядзвінска, самадзейныя артысты.

ПОМНІК нашаму славутаму суайчынніку народнаму мастаку БССР і РСФСР Вітольду Бялыніцкаму-Бірулі будзе ўстаноўлены ў Магілёве. Такую пастанову ў адказ на хадайніцтва магілёўскіх улад прыняў Кабінет Міністраў Беларусі.

КААРДЫНАЦЫЙНЫ савет прамысловых прафсаюзаў Беларусі вырашыў звярнуцца да Прэзідэнта краіны А.Лукашэнкі і ўрада Беларусі і нагадаць пра неабходнасць своечасова выконваць абяцанні па аздараўленню эканомікі. Эканамічную сітуацыю Канстытуцыйны савет акрэсліў як трывожную і надта праблематычную.

З ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫІ

"НАЦЫЯНАЛЬНУЮ СІМВОЛІКУ НЕМАГЧЫМА СТВАРЫЦЬ ШТУЧНА, НЕМАГЧЫМА І АДМЯНІЦЬ ЯЕ ЗАГАДАМ",

— гэта галоўная думка, якая гучала на прэс-канферэнцыі, што наладзілі прадстаўнікі новаўтворанага Грамадскага камітэта абароны беларускай нацыянальнай гістарычнай сімволікі Анатоль Грыцкевіч, Мікола Купава, Уладзімір Конан, Анатоль Трусаў, Мікола Крукоўскі ды Іван Саверчанка напрыканцы красавіка.

Падстаў для стварэння такой арганізацыі ў цяперашніх варунках больш чым дастаткова. Пасля замены гістарычнай дзяржаўнай сімволікі на амаль старую БССРаўскую ў краіне замест аб'яднання грамадства фактычна назіраецца раскол яго, што ніяк не спрыяе развіццю дзяржавы, падрывае яе аўтарытэт у свеце. "Наша сімволіка -- герб Пагоня і бел-чырвона-белы сцяг -- святыні сусветнага маштабу. Яны ёсць высокі ўзор эстэтыкі і мастацкай дасканаласці -- яскравае сведчанне творчага генія народа. Гэта наша гісторыя, нашы карані. Як не паўстае пытання памяняць бацькоў на іншых ці не, не можа быць гаворкі і аб замене дзяржаўнай сімволікі", -- сказаў на прэс-канферэнцыі доктар філасофскіх навук, прафесар Уладзімір Конан. Як паведаміў сябра аргкамітэта Мікола Купава, галоўнымі мэтамі камітэта з'яўляюцца: цывілізаванымі, несупярэчнымі законам Рэспублікі Беларусь сродкамі дасягнуць аднаўлення ў якасці дзяржаўных нацыянальных гістарычных сімвалаў -- герба Пагоня і бел-чырвона-белага сцяга, забяспечваць пастаянную прысутнасць нацыянальных гістарычных сімвалаў у жыцці краіны і народа, прапагандаваць нацыянальныя гістарычныя сімвалы, ажыццяўляючы асветную, даследчую, выставачную, выдавецкую ды іншую дзейнасць.

Камітэт звярнуўся да грамадскасці і ўрада з заявай, у якой, у прыватнасці, гаворыцца: "...Вынікі гэтага "рэферэндуму" не зацверджаныя Вярхоўным Саветам і ня маюць юрыдычнай сілы. Таму герб Пагоня і бел-чырвона-белы сцяг адпаведна закону ад 19 верасня 1991 года з'яўляюцца афіцыйнымі дзяржаўнымі сымбалямі Беларусі. Наша Пагоня — адзін з самых старажытных дзяржаўных гербаў у Еўропе і свеце. Яго ўзнікненне сягае ў глыбокую мінуўшчыну нашага народу. Летапіс зазначыў, што 700 гадоў таму, у канцы XIII стагоддзя, ён набывае статус дзяржаўнага. "Рыцар збройны на кані" сімвалізуе абаронцу Бацькаўшчыны, сведчыць пра неспатольную прагу нашага народа да Волі і Незалежнасці. На шчыце вершніка размешчаны залаты шасціканцовы крыж -- сонечны знак Ярылы, сымбаль веры нябеснай заступніцы Беларусі -- Эўфрасіньні Полацкай.

Белы і чырвоны -- пракаветна-сакральныя, улюбёныя колеры беларусаў. Чырвоная паласа на бялюткім тле палотнішча сцяга -- гэта суладдзе чысціні і мужнасці, знак ахвярных Хрыстовых пакутаў, след пралітай за Волю рыцарскай крыві".

Заяву падпісалі сябры камітэта вядомыя дзеячы беларускай нацыянальнай культуры, навукі, мастацтва, літаратуры, сярод якіх дастаткова ўзгадаць такія імёны, як Васіль Быкаў, Янка Брыль, Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, Радзім Гарэцкі, Уладзімір Кулажанка, Іван Нікітчанка, Пётр Садоўскі, Уладзімір Арлоў і шмат іншых (усяго 65 подпісаў).

Камітэт абвесціць 1996 год у Беларусі годам герба Пагоня і прапануе ўсім патрыятычна-дэмакратычным сілам, грамадскім і палітычным арганізацыям краіны правесці ў гэтым годзе святкаванне 700-х угодкаў яго дзяржаўнасці.

Камітэт звяртаецца да дэпутатаў Вярхоўнага Савета з заклікам не зацвярджаць вынікаў майскага рэферэндуму, стварыць парламенцкую камісію па разгляду адпаведнасці сфармуляваных пытанняў заканадаўства пры правядзенні рэферэндуму. Напрыканцы прэс-канферэнцыі яе арганізатары зазначылі, што камітэт плануе пачаць татальны збор подпісаў у падтрымку нацыянальнага герба Пагоні і бел-чырвона-белага сцяга.

Таіса БАНДАРЭНКА.

ЯКАЯ БУДУЧЫНЯ Ў НАЦЫІ?



Дзесяцігоддзе чарнобыльскай катастрофы -- гэта яшчэ адна нагода для абвостранай, пільнай увагі да тых праблем, якія парадзіла радыяцыйная бяда. І галоўная з іх -- здароўе людзей, якія жылі і жывуць сёння ў забруджаных раёнах. Пра гэта з трывогай гавораць і спецыялісты клінікі Навукова-даследчага інстытута радыяцыйнай медыцыны, што ў Аксакаўшчыне. Калі ў першыя гады пасля катастрофы больш за ўсё хварэлі дзеці з Гомельскай вобласці, як найбольш пацярпелай, то сёння павялічылася колькасць дзяцей з анкалагічнымі захворваннямі шчытападобнай залозы з Лунінецкага і Столінскага раёнаў Брэсцкай.

У гэтай сітуацыі ўсё вастрэй паўстае пытанне забеспячэння неабходнымі медыкаментамі клінікі ў Аксакаўшчыне. Сродкаў, выдзяляемых дзяржавай, яўна недастаткова, а гуманітарная дапамога прыкметна слабее. І калі дзеці -- будучыня нацыі, то якой будзе наша будучыня?!





НА ЗДЫМКАХ: хваробы не даюць літасці і малым; загадчыца радыяцыйнай лабараторыі Вольга ЛАЎНІЧУК вызначае ўтрыманне гармонаў у крыві пацыентаў; Іна ДЗЯНІШЧЫЦ прыбыла ў клініку са Столінскага раёна.

Яўген КАЗЮЛЯ.

"БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ НЕ З'ЯЎЛЯЕЦЦА ВЫНІКАМ НЕДАСТАТКОВАЙ УВАГІ ЗАХАДУ ДА ПРАБЛЕМ БЕЛАРУСІ"

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Вядома, нельга адмаўляць таго, што мы з'яўляемся сведкамі ўсё-такі стрыманай палітыкі, праводзімай Захадам у адносінах да Беларусі. Прычыны таму розныя. Сярод іх не толькі выразна рэалізуемы курс Беларусі на інтэграцыю з Расіяй, але і спецыфічныя ацэнкі ходу эканамічных рэформаў, што адбываюцца ў рэспубліцы.

Калі ў эканамічнай сферы цяжка гаварыць пра якую-небудзь ізаляцыю Беларусі, дык у палітычнай мы сутыкаемся з яўна негатыўнымі падыходамі Захаду ў адносінах да кіраўніцтва нашай рэспублікі. Мы жывём у Еўропе канца XX стагоддзя, калі ідэі стварэння агульнаеўрапейскага дому сапраўды завалодалі розумамі не толькі палітыкаў, але і пераважнай большасці насельніцтва як заходнееўрапейскіх, так і постсацыялістычных краін. Таму працяг Захадам такой палітыкі ў адносінах да нашай рэспублікі можа прывесці да непажаданых з'яў, у прыватнасці, да прыўнясення ў гэтыя ўзаемаадносіны элементаў ідэалагізацыі. У міжнародных адносінах апошнія, як правіла, непазбежна вядуць да з'яўлення напружанасці і нават канфрантацыі.

-- Ці ёсць у дагаворы аб беларуска-расійскім супольніцтве што-небудзь, што выклікае ў вас неспакой?

-- Ёсць хутчэй нейкія сумненні, а іншы раз і неспакой.

Беларусь і Расія -- дзяржавы, цяжка параўнальныя па сваіх памерах і патэнцыялах. Напрыклад, суадносіны насельніцтва -- 1:15, тэрыторыі -- 1:70. Я ўжо не гавару пра вялізную розніцу эканамічных патэнцыялаў. У гэтых умовах рэалізацыя прынцыпаў фармальнай роўнасці двух галасоў пры прыняцці рашэнняў у рамках Супольніцтва патрабуе надзвычай узважаных і паслядоўных дзеянняў прадстаўнікоў рэспублікі ў адпаведных яго органах.

Мне асабіста вельмі хацелася б, каб у саставе Супольніцтва з'явілася трэцяя і нават чацвёртая дзяржава. Два-тры галасы невялікіх краін былі б добрым балансам голасу магутнай Расіі.

У Беларусі цяпер няма ніякай, хоць маленькай, палітычнай сілы, што выступае супраць беларуска-расійскай інтэграцыі. Першы яе этап, у прынцыпе, не нясе ў сабе пагрозы паглынання Беларусі Расіяй.

У наступным, аднак, жыццёва важна збалансаванне механізма такой інтэграцыі, якая магла б быць дасягнута за кошт далучэння да Супольніцтва іншых дзяржаў.

Я -- за асаблівыя адносіны нашых краін, за тое, каб яны былі асабліва блізкія, каб Беларусь заўсёды была абсалютна надзейным стратэгічным партнёрам і сябрам вялікай суседкі ў самых розных сферах узаемадзеяння. Упэўнены, што такое становішча дасягальнае пры ўмове захавання галоўнага -- дзяржаўнасці Беларусі.

-- У якой ступені, на вашу думку, узаемазвязаны ўзмацненне інтэграцыйных тэндэнцый у рамках СНД, з аднаго боку, і адкрытае процідзеянне Захаду пранікненню на свае рынкі збыту тавараў з дзяржаў Садружнасці, а таксама планы пашырэння НАТО за кошт усходнееўрапейскіх дзяржа[illegible] з другога?

-- Не магу сцвярджаць, што цяпер існуе адкрытае процідзеянне Захаду пранікненню на яго рынкі збыту прадукцыі з краін СНД. Вя[illegible], не выклікае сумненняў тое, [illegible]о краіны Заходняй Еўропы ясна і адкрыта абараняюць свае рынкі ад некантралюемага імпарту. Заходнееўрапейская інтэграцыя перш за ўсё мае на ўвазе жорсткае рэгуляванне рынку ў сваіх дзяржавах з мэтай недапушчэння бескантрольнага пранікнення тавараў з краін, якія не ўваходзяць у еўрапейскае супольніцтва.

Нават уступленне ў Еўрапейскі саюз дзяржаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, не гаворачы ўжо пра постсавецкія рэспублікі, патрабуе працяглага працэсу "прыціркі", сумяшчэння параметраў і стандартаў. Тое, што мы называем барацьбой за рынкі збыту, яшчэ вельмі доўга будзе працягвацца на еўрапейскім кантыненце. Перш за ўсё, гэта будзе праяўляцца ў розных формах абароны сваіх рынкаў. Таму нашы кантакты з Заходняй Еўропай будуць жорстка рэгламентаваныя. Гэта трэба разумець і да гэтага трэба быць гатовым.

Тут, вядома ж, не варта цалкам абстрагавацца ад палітычных, стратэгічных матываў. Але ўсё ж трэба зыходзіць з рэалій эканамічнага ўзаемадзеяння дзяржаў на еўрапейскім кантыненце. Тым больш важна ўлічваць і тое, што многія прамысловыя тавары з краін СНД, як правіла, значна ўступаюць па якасці заходнееўрапейскім аналагам і проста неканкурэнтаздольныя на заходнім рынку.

Што датычыцца планаў пашырэння НАТО, дык наўрад ці гэты фактар можа істотна ўплываць на інтэграцыйныя працэсы як у беларуска-расійскіх адносінах, так і ў рамках СНД.

Дзяржавы Садружнасці парознаму ўспрымаюць планы пашырэння Паўночна-Атлантычнага альянсу, аднак усе яны падкрэсліваюць непажаданасць фарсіраванага вырашэння гэтага пытання. Краіны СНД выказваюцца за тое, што калі б працэс пашырэння НАТО і ажыццявіўся, дык абавязкова эвалюцыйна.

Відаць, так яно і будзе. Альтэрнатывы гэтаму не бачу, паколькі іншы шлях можа парадзіць раскол і канфрантацыю на еўрапейскім кантыненце.

-- У выпадку, калі некаторыя ўсходнееўрапейскія дзяржавы ўсё ж будуць прыняты ў Паўночна-Атлантычны альянс, ці існуе верагоднасць стварэння ў рамках СНД ваенна-палітычнага саюза, падобнага да блока краін Варшаўскага дагавора, які існаваў раней?

-- Стварэнне новага ваенна-палітычнага блока на тэрыторыі былога Савецкага Саюза ўжо, відаць, немагчыма. Хоць бы таму, што яго ўдзельніцай яўна не стане Украіна, заканадаўства якой выключае падобную магчымасць.

У цэлым не выключаю стварэння на тэрыторыі СНД не столькі якога-небудзь ваеннага блока, колькі дакладна функцыянуючай сістэмы ўзаемадзеяння ўзброеных сіл новых незалежных дзяржаў. Напрыклад, цяпер ствараецца дастаткова эфектыўная ў рамках Садружнасці адзіная сістэма процілаветранай абароны. Як бачна, ніякі ваенны блок не створаны, але супрацоўніцтва ажыццяўляецца на ўзаемавыгадных для многіх краін -- удзельніц СНД аснове.

-- Можа, ваеннае супрацоўніцтва краін СНД стане больш цесным пасля ўнясення адпаведных карэктываў у цяпер дзеючы Дагавор аб калектыўнай бяспецы?

-- Мне невядома, якой думкі прытрымліваюцца на гэты конт аналітыкі Генеральнага штаба Узброеных Сіл Расіі, аднак зусім ясна, што наша ўсходняя суседка ў ваенным плане была і будзе заставацца краінай з глабальнымі інтарэсамі. Тэма пашырэння НАТО не можа не хваляваць Маскву. І калі Паўночна-Атлантычны альянс прасунецца на Усход, дык гэта непазбежна прывядзе да значных змен у цяперашняй ваеннай дактрыне Расіі. Разам з тым прымаемыя Расіяй у гэтым выпадку меры, на мой погляд, не змогуць змяніць новую геапалітычную сітуацыю, якая складваецца.

-- Канфрантацыя Усходу і Захаду можа стаць рэальнасцю?

-- Спачатку трэба было б дакладна ўявіць, што мы ўкладалі ў паняцце "Усход".

Раней пад "Усходам" разумелі акрамя СССР вялізную частку Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Няхай у параўнанні з Заходняй Еўропай гэтыя тэрыторыі менш развітыя ў тэхналагічным плане, аднак па свайму прамысловаму, людскому патэнцыялу цяпер ужо былыя сацыялістычныя краіны надзвычай дапаўнялі патэнцыял адзінага Савецкага Саюза.

Ці можам мы цяпер укладваць у паняцце "Усход" (у вядомым тлумачэнні гэтага тэрміна) такія рэспублікі, як Казахстан, Узбекістан, Кыргызстан, Туркменістан, Таджыкістан, Арменія, Азербайджан, Грузія, Малдавія, Украіна, не гаворачы ўжо пра Польшчу, Венгрыю, Чэхію і іншыя?

Адназначна можна толькі сцвярджаць, што былыя сацкраіны ўжо ніяк нельга разглядаць у якасці в[illegible]на-палітычных саюзнікаў Ра[illegible]

Такім чынам, пад "Усходам" разумеецца ў асноўным Расія. Але Расія, адна ці разам з Беларуссю, не ў стане процістаяць Захаду. Таму, на мой погляд, мы наблізіліс[illegible] нейкага зусім новага с[illegible]овішча ў міжнародных адносінах, пры якім адзіна правільным рашэннем быў бы больш інтэнсіўны і настойлівы пошук шляхоў разумення і ўзаемадзеяння Расіі і Еўропы.

Калі б Беларусь уступіла ў цесны двухбаковы ваенны саюз з Расіяй, патэнцыяльна магчымая канфрантацыя з Захадам закранула б і нашу рэспубліку. Лічу, што дзяржавы -- члены СНД не захочуць блакіравацца з Расіяй для процістаяння Захаду.

Гісторыя адносінаў Усходу і Захаду ведае нямала "пахаладанняў" і "адліг". Думаю, што занадта моцнай, палітызаванай канфрантацыі, якая даходзіць да якіх-небудзь ваенных захадаў, не адбудзецца. У цэлым раззбраенчыя тэндэнцыі ў свеце будуць прагрэсіраваць, хоць ядзерныя ракеты яшчэ доўга будуць знаходзіцца на ўзбраенні шэрагу дзяржаў, выконваючы функцыю "стрымлівання". Вельмі многае будзе залежаць ад развіцця падзей у Расіі і, у прыватнасці, ад поспехаў праводзімых там эканамічных рэформаў...

-- Ці можна цяпер меркаваць, які характар здольна мець канфрантацыя Усходу і Захаду? У адрозненне ад процістаяння часоў "халоднай вайны", калі ў "барацьбе светаў" далёка не апошнюю ролю адыгрывалі ідэалагічныя ўстаноўкі, новае процістаянне, у прынцыпе, здольнае стаць дзідэалагізаваным: усе краіны СНД, у тым ліку і Расія, узялі цвёрды курс на рынычныя пераўтварэнні, і іх падыходы да дзяржаўнай палітыкі даволі падобныя да падыходаў заходніх дзяржаў. Гісторыі вядома нямала фактаў, калі саперніцтва ідэалагічных саратнікаў праходзіла ў намнога больш вострых формах, чым ідэалагічных праціўнікаў...

-- Вельмі важна, каб у знешняй палітыцы ні ў Расіі, ні ў Захаду не перамагалі якія-небудзь ідэалагічныя меркаванні.

Сама меней непераканаўчымі здаюцца выказванні прыхільнікаў далейшага пранікнення НАТО на Усход аб тым, што гэты працэс з'яўляецца пашырэннем сферы дэмакратыі. Гэта не можа быць пераканаўчым аргументам яшчэ і таму, што сотні мільёнаў людзей, якія выраслі ва ўмовах ідэалагічнай канфрантацыі часоў "халоднай вайны", вельмі негатыўна ўспрымаюць ідэю пашырэння НАТО. Ва ўспрыманні большасці дарослага насельніцтва краін Садружнасці НАТО цяпер ужо не варожая арганізацыя, аднак яшчэ і не дружалюбная.

Калі Паўночна-Атлантычны альянс мае намер пашырацца, дык павінна існаваць адпаведная ўзаемапрыдатная для ўсіх бакоў канцэпцыя. Трэба памятаць: нельга ўмацаваць уласную бяспеку за кошт аслаблення бяспекі суседа.

-- Ці існуе рэальна выканальны рэцэпт правядзення Усходам і Захадам палітыкі, якая выключае якія-небудзь ускладненні ва ўзаемаадносінах?

-- Важна разумець: Расіі і нам будзе вельмі складана перашкодзіць імкненню былых сацыялістычных краін Еўропы ўступіць у НАТО. Гэтае жаданне прадыктавана зусім не імгненнай палітычнай кан'юнктурай, а абумоўлена іх гістарычным вопытам.

Тая ж Польшча здаўна ўспрымала Расію як крыніцу замахаў на свае нацыянальныя інтарэсы. Апошні раз інтарэсы Польшчы Савецкі Саюз ушчаміў у 1939 годзе -- шляхам перадзелу дзяржаўных межаў, якія існавалі тады, а ў 1945 годзе шляхам навязвання чужога палякам сацыялізму.

У сітуацыі, што цяпер склалася ў свеце, ідэальнай формулы прадухілення якіх-небудзь супярэчнасцей не існуе. Усяму сусветнаму супольніцтву трэба імкнуцца дасягаць узаемных кампрамісаў у імя галоўнай мэты -- міру і добрасуседскага супрацоўніцтва.

Кожны крок у гэтым напрамку павінен разглядацца як элемент стварэння новай сістэмы міжнароднай бяспекі. Менавіта так трэба ўспрымаць паглыбленне інтэграцыі паміж Беларуссю і Расіяй, якая па сваёй сутнасці з'яўляецца натуральным і неад'емным кампанентам агульнаеўрапейскай інтэграцыі. Мэта беларуска-расійскіх пагадненняў -- умацаванне стабільнасці як на постсавецкай прасторы, так і ў Еўропе ў цэлым. Такія ж мэты, на мой погляд, павінна праследаваць і палітыка заходніх краін на еўрапейскім кантыненце.

ВЕЧАРЫНА, ПРЫСВЕЧАНАЯ БАРЫСУ КІТУ

ДУША НЕ ПАДАРОЖНІЦА

Пагодным веснавым надвячоркам 4 красавіка гэтага года ў Маладзечанскай гарадской цэнтральнай бібліятэцы адбылася ўрачыстая вечарына, прысвечаная 86-годдзю славутага вучонага ў галіне астранаўтыкі і касмічных даследаванняў, а таксама вядомага грамадска-асветніцкага дзеяча Барыса Кіта.

Паўстагоддзя наша грамадства на Беларусі нічога не ведала і не чула пра гэтага легендарнага чалавека, які напрыканцы другой сусветнай вайны не па сваёй волі вымушаны быў адправіцца ў эміграцыю, дзе і пражыў больш паловы свайго жыцця. Акрамя асобных грамадзян, пераважна яго вучняў, да апошняга часу не ведалі пра Барыса Уладзіміравіча і ў нашым горадзе Маладзечне, дзе ён у час ваеннага ліхалецця жыў і працаваў. Нягледзячы на жорсткія ўмовы нямецкага акупацыйнага рэжыму, ён здолеў арганізаваць, а затым стаць дырэктарам Маладзечанскай сярэдняй гандлёва-адміністрацыйнай школы, якую змаглі наведваць многія юнакі і дзяўчаты як з самога горада, так і з навакольных вёсак і мястэчак. Давялося і мне быць вучнем той школы і скончыць тры яе курсы.

Але толькі пасля таго, як у краіне змянілася палітычная сітуацыя, я змог сустрэцца са сваім былым дырэктарам і настаўнікам, калі ўлетку 1992 года Барыс Уладзіміравіч упершыню пасля вайны наведаў сваю Бацькаўшчыну і нават на некалькі гадзін заехаў у Маладзечна, дзе яму наладзілі цёплую сустрэчу яго былыя выхаванцы.


У 1993 годзе ў Мінску выйшла з друку кніжка Лідзіі Савік "Вяртанне" (жыццяпіс Барыса Уладзіміравіча Кіта), з якой усім стала магчымым больш даведацца пра вучонага, пра яго жыццё ў Заходняй Беларусі і ў замежжы. У 1995 годзе з'яўляецца на Беларусьфільме на студыі "Летапіс" дакументальная кінастужка пра Барыса Кіта пад назвай "Душа не падарожніца", створаная таленавітымі кінарэжысёрам і кінааператарам Рычардам Ясінскім і Львом Слобіным. Таму і ўзнікла ідэя правесці на гэтым матэрыяле імпрэзу ў Маладзечне, прымеркаваную да дня нараджэння вучонага.

І вось у афармленай адпаведна гэтай падзеі зале перад шматлікімі слухачамі выступіла член Саюза пісьменнікаў Беларусі, аўтар кнігі "Вяртанне" Лідзія Савік. Яна падрабязна расказала прысутным пра самыя цікавыя і значныя старонкі жыцця Барыса Уладзіміравіча, пра яго радавод, дзяцінства ў Пецярбургу, вучобу ў Навагрудскай гімназіі, у Віленскім універсітэце імя Стэфана Баторыя, пра плённую выкладчыцкую і грамадскую дзейнасць у тагачаснай Віленскай беларускай гімназіі, удзел у адраджэнскім руху ў даваеннай Беларусі і асабліва ў пашырэнні і арганізацыі беларускага школьніцтва ў перыяд з 1939 па 1941 год, калі Барыс Кіт быў ужо савецкімі ўладамі прызначаны ў Баранавіцкай акрузе інспектарам школ, калі спатрэбілася аднаўляць нацыянальную асвету, страчаную ў час польскага панавання, у выніку чаго беларуская мова была выключана з праграм нават як прадмет. Затым вайна, арганізацыя с[illegible]дняй школы ў Маладзечне, [illegible]оза з боку нямецкіх акупан[illegible]у, якая ледзь не скончылася расстрэлам у засценках гастапа, пасля выезд на Захад.

Усіх нас вельмі ўразілі звесткі пра яго тытанічную навуковую і грамадскую дзейнасць у эміграцыі, пра тое, як ён удалечыні ад Радзімы дапамагаў сваім суайчыннікам, заўсёды памятаў і пра нас, былых сваіх вучняў у Маладзечне, што засталіся пад гнётам таталітарнага рэжыму, які ў той ці іншай меры вынішчаў толькі за тое, што мы вучыліся ў школе падчас акупацыі, набывалі веды.

Лідзія Савік паведаміла, што неўзабаве выйдзе з друку другое, дапоўненае, больш грунтоўнае выданне кнігі пра гэтага легендарнага чалавека, якую зможа набыць больш шырокае кола нашых грамадзян і пазнаёміцца з жыццём і дзейнасцю вучонага.

Давялося і мне, як былому яго вучню, напэўна ўпершыню так адкрыта сказаць пра значэнне, якое мела ў далейшым жыцці многіх з нас вучоба ў тагачаснай сярэдняй школе пад кіраўніцтвам Барыса Кіта, дзе выкладалі шчырыя беларусы, высокаадукаваныя інтэлігентныя людзі, адданыя асветніцкай справе. Гэта дапамагло нам не застацца невукамі, і менавіта ў тыя гады ў тым школьным асяроддзі сфармавалася ў многіх з нас нацыянальнае пачуццё. Нават лагеры і турмы, пройдзеныя некаторымі "гандлёўцамі", не перашкодзілі ім стаць сумленнымі людзьмі, прыстойнымі грамадзянамі як у асабістым, так і грамадскім жыцці. Я ў лагер не трапіў. Але кляймо "неблагонадежного" не мінула і мяне. Двойчы, адзін раз у Вільні, другі ў Мінску, мне было адмоўлена ў атрыманні вышэйшай мастацкай адукацыі. Але, як аказалася, тыя некалькі год вучобы ў Барыса Уладзіміравіча і яго паплечнікаў па асветніцтву не прайшлі дарэмна. Грунтоўныя веды, асабліва ў галіне гуманітарных дысцыплін, любоў да сваёй Радзімы, яе гісторыі і культуры мне вельмі дапамаглі ў мастакоўскай творчасці, дапамаглі не стаць прыстасаванцам і апалагетам вульгарнага, так званага "сацыялістычнага рэалізму" ў мастацтве. Затое і сёння мне не сорамна ні за адзін свой твор, асобныя з якіх ужо ўвайшлі ў гістарыяграфію беларускага нацыянальнага жывапісу.



Сувязь і сустрэчы з былымі сябрамі па гандлёвай школе і асабліва з Барысам Уладзіміравічам, спадзяванні на нацыянальнае адраджэнне, на здзяйсненне ідэалаў, што луналі ў нашым юнацтве, якое бышцам бы стала магчымым у новай палітычнай сітуацыі пасля 1991 года, дапамаглі мне і ў вялікім бацькоўскім горы, калі я страціў адзінага сына. Я застаюся верным ідэалам беларушчыны, прышчэпленым мне Б. К[illegible]м і іншымі настаўнікамі, [illegible] дадае мне сілы і падтрымлівае ў творчай і грамадскай дзейнасці і ў сённяшнія, складаныя і супярэчлівыя дні.

А закончылася ўрачыстая вечарына, прысвечаная Б. Кіту, паказам цудоўнай кінастужкі "Душа не падарожніца". Незабыўнае ўражанне засталося ад кінакадраў, калі з экрана да прысутных у кіназале звяртаецца мудры чалавек з запаветамі любіць сваю радзіму Беларусь, шанаваць родную мову, сваю нацыянальную навуку і культуру, фарміраваць свой светапогляд на гуманістычных, агульначалавечых, агульнасусветных каштоўнасцях. Мы ўбачылі ў тым кінафільме і фантастычнае падарожжа чалавека на Месяц, якое стала магчымым у выніку рэалізацыі касмічнай амерыканскай праграмы "Апола", створанай выдатнымі вучонымі нашага стагоддзя, у ліку якіх пачэснае месца займае і Барыс Кіт.

Кастусь ХАРАШЭВІЧ,
член Саюза мастакоў Беларусі,
былы вучань Барыса Кіта ў Маладзечне.

НА ЗДЫМКУ: Б. КІТ. Скульптурны медальён работы І. МІСКО.

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ПРЫВІД БЕЛАРУСКАЙ ІДЭІ

РЭЭМІГРАЦЫЯ

Першым жа на такі крок ужо праз дзесяць дзён пасля пасяджэння згаданай вышэй Рады народных міністраў БНР адважыўся старшыня яе ўрада Аляксандр Цвікевіч. Пайсці на такое, бясспрэчна, падштурхнула яго вера ў рэальнасць імкнення партыйных і савецкіх органаў Беларусі да яе нацыянальна-культурнага Адраджэння. І ўсё ж багаты прафесійны вопыт палітыка, тая роля, якую ён выконваў у беларускім нацыянальным руху, не давалі адважыцца на такое неабдуманае рашэнне. Рана ці позна Аляксандру Цвікевічу маглі б нагадаць пра яго старшынства на канферэнцыі Беларускай Сацыялістычнай Грамады (Масква, 1917 год), працу ў Рэдакцыйнай камісіі Усебеларускага з'езда (Мінск, снежань 1917 года), дыпламатычную службу ад імя ўрада БНР на Украіне і ў Заходняй Еўропе, выкананне ў 1923—1925 гадах у Празе функцый прэм'ера БНР. З гэтай апошняй высокай дзяржаўнай пасады і вярнуўся Аляксандр Цвікевіч у Савецкую Беларусь, хаця яго радзіма Берасце (Брэст-Літоўск) знаходзілася ў той час пад уладай Польшчы. Аляксандру Цвікевічу, як тэарэтычна добра падрыхтаванаму чалавеку, прапанавалі працу ў Інстытуце беларускай культуры. З рэарганізацыяй данай навуковай установы ў Беларускую акадэмію навук ён стаў тут старшынёю Камісіі па вывучэнні асветы на Беларусі. Гэта была надзвычай адказная пасада, бо беларусізацыя ў сферы асветы набыла шырокія маштабы, таму ўзнікла неадкладная патрэба дасканала даследаваць як яе далёкі гістарычны, так і яшчэ зусім свежы, сыры практычны вопыт.

Буйны палітычны дзеяч і вучоны Аляксандр Цвікевіч вельмі хутка станоўча заявіў пра сябе ў зусім новых, нязвыклых умовах жыцця ў Савецкай Беларусі. Яго папулярнасці ў першую чаргу садзейнічала гістарычная публіцыстыка, якая прысвячалася самым адметным старонкам у жыцці беларускага народа. З асаблівай цікавасцю чыталі на старонках часопіса "Полымя" яго самую буйную, галоўную працу "Западно-руссизм", якая пачала друкавацца з N 8 1927 года і закончылася ў N 5 за 1929 год. Пад гэты час у Мінску яна ўжо была выдадзена паасобнай кніжкай, але адразу ж папала пад арышт як нібыта нацыяналістычная паводле свайго зместу. І гэта не дзіўна, бо на Беларусі шырокія працягі набірала барацьба з "нацдэмакратызмам" і таму ўсё, што хоць крыху выходзіла за рамкі поглядаў афіцыйнай гістарычнай навукі на нацыянальнае пытанне ў мінулым ці сучасным жыцці Беларусі, магло аб'яўляцца варожым, нацыяналістычным. Адшукаць такія месцы ў працы А.Цвікевіча не было складаным для прыдзірлівых крытыкаў, бо ён смела і аб'ектыўна пісаў, як ад моманту падзелаў Рэчы Паспалітай праводзілася мэтанакіраваная палітыка свецкіх і духоўных уладаў Расійскай імперыі па дэнацыяналізацыі нашага краю, што, натуральна, не падабалася тым, хто не супраць быў бы стаць на такі шлях і ў Савецкай Беларусі, душой і сэрцам не прымаючы практычных захадаў у галіне дзяржаўнай палітыкі беларусізацыі.

Крайне неразважлівым трэба прызнаць рашэнне аб вяртанні ў БССР удзельніка Слуцкага збройнага чыну, віцэ-старшыні Рады Случчыны Беларускай Народнай Рэспублікі Уладзіміра Пракулевіча. Пазней, ад жніўня 1923 да кастрычніка 1925 года, ён займаў пасаду пісара ва ўрадзе БНР. Усё гэта некалі будзе пастаўлена яму ў віну, стане прычынай зняволення і смерці ў ГУЛАГу.

Прэцэдэнт з вяртаннем значнай часткі бэнэраўцаў на Беларусь моцна паўплываў на настрой і намеры нашых суродзічаў, што атабарыліся ў іншых краінах. Калі б не было такога факта, многія змірыліся б і жылі спакойна ў адпаведнасці з умовамі сваёй другой радзімы. Палічыў, што больш карысці прынясе свайму народу, жывучы і працуючы ў Савецкай Беларусі, і Вацлаў Ластоўскі. Прыняўшы такое рашэнне ў канцы 1927 года, ён заклікаў і іншых вядомых палітычных і культурных дзеячаў нашай эміграцыі дзейнічаць аналагічным чынам.

Як і многія іншыя прадстаўнікі беларускай палітычнай эміграцыі, В.Ластоўскі да прыезду ў БССР таксама займаўся даволі важнымі справамі. На працягу амаль трох з паловай гадоў (снежань 1919 — красавік 1923 года) выконваў функцыі Старшыні Рады Народных Міністраў БНР, а эмігрыраваўшы ў 1923 годзе ў сталіцу Літвы Коўна, цалкам адышоў ад палітычнай дзейнасці і займаўся выдавецкай, а таксама навуковай, што ўдавалася вельмі лёгка спалучаць дзякуючы рэдагаванню часопіса "Крывіч". Коўна стала месцам выдання такіх шырока вядомых у нас прац В.Ластоўскага, як "Расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік" (1924), "Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі" (1926), у якой дадзены глыбокі аналіз помнікаў беларускага рукапіснага і друкаванага пісьменства X—XVIII стагоддзяў.

Як добрага знаўцу беларускай гісторыі і лексікографа, В.Ластоўскага запрасілі для ўдзелу ў працы Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі, якая праходзіла ў Мінску 14—21 лістапада 1926 года. Яго выступленні датычылі самых актуальных пытанняў беларускага мовазнаўства, вызначаліся грунтоўным выкладам, глыбінёй ведаў. Першыя два-тры гады на Беларусі былі даволі пленнымі для творчай і навуковай дзейнасці В.Ластоўскага. Спачатку даверылі ўзначаліць Беларускі дзяржаўны музей, затым выбралі неадменным сакратаром Інбелкульта, а ў 1928 годзе — акадэмікам Беларускай акадэміі навук. Калі ў канцы 20 — пачатку 30-х гадоў у рэспубліцы разгарнулася барацьба з надуманымі нацдэмамі, у лік іх адным з першых трапіў і В.Ластоўскі. Дзеля гэтага добра пастараўся вядомы на той час філосаф афіцыйнага накірунку, акадэмік БАН Сямён Вальфсон. У першым томе выдадзенай у 1931 годзе кнігі "Навука на службе нацдэмаўскай контррэвалюцыі. Ідэалогія і метадалогія нацдэмократызму" ён прысвяціў нямала месца выкрыццю "варожай" савецкай уладзе дзейнасці В.Ластоўскага. Прадузята аналізаваліся многае з таго, што ім пісалася ў першыя гады пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў небальшавіцкім друку, у прыватнасці і цікавы артыкул "Што трэба ведаць кожнаму беларусу", змешчаны ў газеце Беларускага нацыянальнага камітэта "Вольная Беларусь" (1918, N 29). Зразумела, не абышоў філосаф-выкрывальнік "нацдэмаў" і шэрагу артыкулаў з часопіса "Крывіч", які выходзіў у Коўне ў 1923—1927 гадах пад рэдакцыяй В.Ластоўскага. Пасля падрабязнага аналізу ўмела вырваных з розных публікацый цытат С. Вальфсон заключае: "Ластоўскі — ...смяротны вораг рэвалюцыі" (с.37). Такім ён неўзабаве стане і ва ўяўленнях дзеячаў савецкага правасуддзя, якія выкажуцца ў 1938 годзе за вынясенне смяротнай кары аднаму з выдатных пачынальнікаў нацыянальнага руху на Беларусі.

Пазітыўныя зрухі ў нацыянальным жыцці Савецкай Беларусі, адпаведная ідэалагічная работа кампартыі ў асяроддзі эміграцыі прычыніліся да таго, што большасць палітычных і культурных дзеячаў беларускага замежжа падтрымала пазіцыю ўрадоўцаў БНР, хаця былі і такія, што адразу не паверылі ў шчырасць дзяржаўных і партыйных органаў БССР і таму не рабілі аніякіх практычных крокаў, каб пераехаць на Бацькаўшчыну.

На першым часе вяртанне беларускіх эмігрантаў на Радзіму нічога кепскага не прадракала ім. Наадварот, сустрэлі іх належным чынам, забяспечылі ўсіх працай.

Леанід ЛЫЧ,
доктар гістарычных навук, прафесар.

Працяг.
Пачатак у №№ 16—17.

САР'Я

(НАРЫС З ГІСТОРЫІ МАЁНТКА І РОДУ ЛАПАЦІНСКІХ)

Восенню 1842 года бацька з дачкой вярнуліся ў Вільню, дзе перш за ўсё давялося парадчыць фінансавыя справы сям'і, якія да гэтага часу вельмі няўдала вёў брат пана Станіслава і пакінуў пасля сваёй смерці шмат крэдытораў. Каб сумленна разлічыцца з усімі, Шумскаму давялося мець вялікія выдаткі, што амаль пазбавіла пасагу адзіную каханую дачку. Бацькоўскі клопат і смутак з тае прычыны быў развеяны толькі пасля таго, як да Марылі пачаў заляцацца Ігнат Лапацінскі, у асобе якога пан Станіслаў убачыў чалавека, якога цікавіў не пасаг дачкі, а "выключна яе добрыя якасці". З лёгкім сэрцам ён благаславіў шчаслівы шлюб, ад якога пасля ўсіх пакут і прыгод маладосці меў найвялікшую ўцеху і найвялікшы смутак.

Першае дзіця Марылі і Ігната -- сын Юзаф -- нарадзілася ў 1847 годзе ў падвіленскіх Кайранах. Аднак праз тры гады хлопчык памёр ад дызентэрыі ў Сар'і . У 1848 годзе ў Лапацінскіх нарадзілася дзяўчынка, якую назвалі Соф'яй.

Міналі гады, напоўненыя сямейным шчасцем і згодай. Ігнат з сям'ёй жыў у Сар'і, аднак часам наведваўся ў маёнтак да маці, прымаў у госці цесця, іншых родзічаў ды знаёмых. Бяда ў дом прыйшла неспадзявана: 17 красавіка 1851 года, захварэўшы пасля родаў сына Станіслава, памерла Марыля Лапацінская. Вельмі глыбока перажываў смерць адзінай дачкі Станіслаў Шумскі. Пасля пахавання Марылі на могілках у Сар'і ён застаўся ў маёнтку, дзе па прапанове і пад націскам зяця пачаў пісаць мемуары аб маладосці і падзеях 1812—1848 гадоў. У выглядзе асобнай кніжкі пад назваю "У баях і вязніцах" яны былі выдадзены ў Вільні ў 1931 годзе.

Ігнат Лапацінскі, як адзначала Г. Пузына, адну толькі Марылю "кахаў у жыцці і заставаўся ёй верным пасля смерці". У радзіннай Сар'і ён вырашыў узвесці ў гонар памерлай жонкі новы мураваны касцёл.



САР'ЯНСКІ КАСЦЁЛ

Мураваная каталіцкая капліца ў Сар'і была ўзведзена яшчэ ў XYIII стагоддзі. Адчынілася яна летам 1796 года з вышэйшага дазволу арцыбіскупа Магілёўскага і мітрапаліта рыма-каталіцкіх цэркваў Расійскай імперыі Станіслава Богуша-Сестранцэвіча. Размяшчалася капліца на адлегласці ўсяго 50 сажняў ад сядзібнага дома, "пры самім панскім двары", і лічылася філіяй парафіяльнага касцёла ў Росіцы. Для зручнасці сям'і Лапацінскіх у жылым панскім доме ў Сар'і была ўладкавана яшчэ адна невялікая дамавая капліца з прастолам у імя Прасвятой Багародзіцы. Новы касцёл Ігнат Лапацінскі вырашыў пабудаваць побач з могілкамі, на якіх знайшлі свой супакой яго жонка і малалетні сын Юзаф.

Варта адзначыць, што вызначэнне аўтарства большай часткі беларускіх помнікаў дойлідства — справа звычайна досыць складаная, бо абцяжарана яна найперш адсутнасцю належных архіўных крыніц, шмат з якіх загінула ў ліхой віхуры часу. У выпадку з Сар'янскім касцёлам мы маем надзвычай рэдкую мажлівасць высветліць не толькі імя аўтара праекта храма, але нават і імёны яго мурШчыкаў, а таксама ўсю падрабязную гісторыю будаўніцтва, якую аказаліся ў стане распавесці нам дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

Гісторыя ўзвядзення новага мураванага касцёла ў Сар'і пачалася 10 траўня 1851 года, калі Ігнат Лапацінскі літаральна праз некалькі тыдняў пасля смерці жонкі заключыў пісьмовую дамову на складанне праекта храма і кіраўніцтва ўсімі будаўнічымі працамі з архітэктарам "Густавам Вільгельмавым сынам Шахтам". Шаноўны дойлід паходзіў з Нямеччыны, быў аўтарам праектаў некалькіх касцёлаў у межах Вялікага Княства Літоўскага і на той час жыў у мястэчку Асвеі, што знаходзілася на адлегласці 17 вёрст ад Сар'і і належала сваякам Лапацінскіх магнатам Шадурскім. Праект храма ў хуткім часе быў гатовы, і 15 чэрвеня 1851 года Ігнат Лапацінскі падпісаў яшчэ адну дамову -- з селянінам мястэчка Кубліч Лепельскага павета Віцебскай губерні Іванам Шараметам, які быў высокакваліфікаваным муршчыкам. Сабе ў памочнікі І.Шарамет наняў яшчэ трох сялян маёнтка Сар'я — Аляксандра Емяльяна, Міхаіла Ісакава і Івана Ледака. Паводле ўмоў пагаднення, за якаснае і своечасовае выкананне будаўнічых прац чатыры муршчыкі павінны былі атрымаць ад Лапацінскага 750 рублёў срэбрам. У ліпені месяцы, "каля Св.Іллі", сяляне ўзяліся за рыдлёўкі і да надыходу восені паспелі выкласці падмуркі касцёла, асвяціць якія прыязджаў вікары Росіцкага храма ксёндз Чулдо.

Новы касцёл пачалі будаваць на адлегласці ўсяго 16 сажняў ад фамільных могілак Лапацінскіх, і ў наступныя два гады вяліся працы па ўзвядзенні сцен храма. Па загаду ўладара маёнтка на будоўлі працавалі прыгонныя сяляне-падзёншчыкі, напачатку 12, а потым 16 чалавек. К канцу 1853 года сцены будынка былі канчаткова выведзены і накрыты дахам, невялікай д[illegible]ацоўкі патрабаваў толькі галоўны ф[illegible] будынка. Аднак менавіта ў гэты ча[illegible]ната Лапацінскага напаткалі вялікія непрыемнасці, якія надоўга адцягнулі справу заканчэння будаўніцтва храма.

Губернскімі ўлад[illegible] супраць уладара Сар'і была ўзбуд[illegible] справа, якая ў канцылярыі Віцеб[illegible]ага губернскага праўлення атрымала наступнае найменне: "Аб пабудове памешчыкам Лапацінскім у яго маёнтку Сар'і мураванага касцёла без дазволу начальства". Справа ў тым, што яшчэ пасля паўстання 1831 года царскія ўлады ўзялі курс на жорсткую рэгламентацыю жыцця каталіцкага касцёла на тэрыторыі Расійскай імперыі. Паўсюдна зачыняліся кляштары, манахі каталіцкіх ордэнаў выдаляліся з гарадоў і мястэчак, касцёлы перадаваліся, як правіла, у падпарадкаванне ведамству праваслаўнага веравызнання. На гэтым фоне адкрыццё новых касцёлаў было абцяжарана многімі складанасцямі. Ігнат Лапацінскі, ахоплены роспаччу і тугою пасля смерці каханай жонкі, відаць, не жадаў цярпліва выходжваць у бюракратычных структурах імперыі афіцыйны дазвол на тое, што лічыў сваім абавязкам хрысціяніна. Таму новы касцёл у Сар'і ён пачаў узводзіць сапраўды выключна з уласнае волі, не маючы на тое дазволу ні ад свецкіх уладаў, ні ад рыма-каталіцкай кансісторыі.

Халаднаватымі восеньскімі днямі 1853 года з губернскага Віцебска ў няблізкую дарогу да Сар'і выправіўся чыноўнік асобых даручэнняў Алфёраў, якому даручана было правесці "строжайшее дознание" ўсіх зламысных намераў законанепаслухмянага памешчыка. Прыбыўшы на месца, чыноўны чалавек пачаў, што называецца, збіраць інфармацыю: па чарзе апытаў самога ўладара маёнтка, архітэктара Густава Шахта, муршчыкаў, навакольных сялян. Каб пазбавіць сябе ад запішніх непрыемнасцяў з уладамі, Ігнат Лапацінскі вырашыў афіцыйна абвясціць узведзенае на яго сродкі збудаванне не касцёлам, а толькі спецыфічнага выгляду помнікам побач з магіламі жонкі і сына. Чыноўніку Алфёраву ён паведаміў, што збіраецца размясціць у помніку бюсты памерлых продкаў, фамільны архіў, бібліятэку, розныя старажытнасці, а таксама зрабіць на галерэі лабараторыю. "Помнік, які насупраць магілы памерлай жонкі Ігната Лапацінскага знаходзіцца, ніяк прызнаны за касцёл быць не можа", — пацвердзіў падчас "дознания" афіцыйную версію ўладара маёнтка і архітэктар Г.Шахт.

Па выніках сваёй адказнай місіі чыноўнік Алфёраў склаў данясенне, якое было ўключана ў рапарт другога аддзялення Віцебскага губернскага праўлення, адасланы 7 траўня 1854 года "его высокопревосходительству" генерал-губернатару Віцебскай, Магілёўскай і Смаленскай губерняў. Рапарт утрымліваў, у прыватнасці, падрабязны акт агляду будынка. У ім адзначалася наступнае: "Узведзены памешчыкам Лапацінскім у маёнтку яго мураваны будынак звонку вышынёй 19 1/4 аршын, знутры даўжынёю 25 1/2 аршын, а шырынёю 12 аршын. На гэтым будынку мяркуецца ўладкаваць 16 вежаў. Во[illegible] па баках 3. Столь уладкавана скляп[illegible] з цэглы. Па баках будынка дзве прыбудоўкі. У адной з паўночнага боку зроблена акно, а ў другой з паўднёвага боку таксама акно і дзверы для ўваходу ў яе. А другія дзверы для ўваходу ў бу[illegible]нак. Над галоўным уваходам на ўсю [illegible]ню будынка ўзведзена і заснавана [illegible] двух слупах або паўкалонах, умураваных у сцены, скляпенне, на якім распачаты балкон або галерэя. Насупраць уваходу ў галоўнай сцяне, унутры будынка, зроблена выемка або незанятае месца ў глыбіню больш за аршын, у вышыню да 3 аршын, а ў шырыню каля 1,5 аршына. Будынак увогуле элегантнай архітэктуры, знутры і звонку ў канструкцыі яшчэ не скончаны". Як бачым, у тоне афіцыйнай паперы адавочнай агрэсіі да ўладара сар'янскага збудавання быццам бы не прасочваецца.

Аднак цалкам прытупіць пільнасць губернскіх уладаў Ігнату Лапацінскаму ўсё-такі не ўдалося. Рапарт заканчваўся наступнымі словамі: "Першы пакой, названы Лапацінскім прыхожым, цалкам адпавядае прытвору; (...) другі пакой, названы Лапацінскім бібліятэкай, па велічыні сваёй адпавядае месцу храма, дзе моліцца народ. Далей трэці пакой, названы Лапацінскім помнікам, вельмі падыходзіць для алтара. Зрэшты, два па баках ад гэтага пакоя памяшканні, названыя Лапацінскім архівам і вартоўняй, могуць служыць для сакрысцій і для складвання царкоўнага начыння (...) Увесь будынак прыстасаваны для царкоўнай службы, варта толькі асвяціць яго".


Дзеля далейшага вырашэння справы "его высокопревосходительству" гаспадзіну генерал-губернатару спатрэбіліся больш дэталёвыя звесткі пра асобу вальнадумнага памешчыка, якія ён змог пачарпнуць з рапарта генерал-маёра Какушкіна ад 28 траўня 1854 года. У рапарце, у прыватнасці, гаварылася: "Лапацінскі (...) валодае ў Дрысенскім павеце 2 тысячамі душ і ў Віленскай губерні 3 тысячамі 700 душамі, мае маці, што жыве ў Віленскай губерні, якая, прадставіўшы ўвесь маёнтак у поўнае яго распараджэнне, карыстаецца ад яго ўтрыманнем. Па марнатраўству свайму атрымліваючы звыш вызначанай сумы на ўтрыманне, давяла яго да разладжанага стану. Сам жа Лапацінскі, з'яўляючыся з маладых гадоў удаўцом, мае малалетніх сына і дачку і на іх выхаванне звяртае ўсю сваю клапатлівасць (...) Вядзе жыццё сціплае, і калі ён мае якія-небудзь шкодныя намеры, то з-за абмежаванасці разумовых здольнасцей уплыву на іншых распаўсюджваць не можа". Як бачым, дакумент быў складзены ў не надта прыемных для Ігната Лапацінскага словах. Аднак хто ведае, можа менавіта яны і ўратавалі шляхціца ад суровага пакарання. Ва ўсялякім выпадку, справе не быў дадзены далейшы ход, што дазволіла Ігнату Лапацінскаму ў наступныя гады бесклапотна скончыць распачатае будаўніцтва.

Калі ўладару Сар'і і ўдалося ўзвесці будынак касцёла без афіцыйнага дазволу ўладаў, то карыстацца ім як культавым збудаваннем без працэдуры асвячэння ён ніяк не мог. На дапамогу сыну ў гэтай справе вырашыла прыйсці Дарота Лапацінская. Карыстаючыся сваімі разгалінаванымі свецкімі сувязямі, яна ў жніўні 1856 года праз пасрэдніцтва Віленскага, Гродзенскага і Ковенскага ваеннага генерал-губернатара перадала міністру ўнутраных спраў хадайніцтва з просьбай аб дазволе яе сыну перанесці старую заняпалую капліцу ў маёнтку Сар'я на фамільныя могілкі. Хіба маглі ў Пецярбургу ведаць усе перыпетыі сар'янскай справы? Вядома, што не. Напэўна, таму, пратрымаўшы для парадку паўгода ў канцылярскіх папках прашэнне Дароты Лапацінскай, вырашылі яго станоўча. Наступныя паўгода справа разглядалася ў духоўнай кансісторыі. Зрэшты, 15 сакавіка 1857 года мітрапаліт усіх рыма-каталіцкіх касцёлаў у Расійскай імперыі Вацлаў Жылінскі выдаў спецыяльнае прадпісанне аб асвячэнні новага касцёла ў Сар'і і перанясенні ў яго набажэнства. Такім чынам, супольнымі намаганнямі маці і сына мэта была дасягнута. Цырыманіял асвячэння Сар'янскага касцёла адбыўся ў чэрвені таго ж года, а ўжо ў ліпені месяцы святую імшу ў храме адслужыў сам мітрапаліт Жылінскі.

Узведзены з чырвонай неатынкаванай цэглы Сар'янскі касцёл захаваўся да нашага часу і зараз з'яўляецца адным з самых выразных узораў архітэктуры неаготыкі на Беларусі. Выкарыстоўваючы багацце вытанчаных, вертыкальна імклівых цагляных цяг, ніш, гранёных контрфорсаў, востраканцовых аркатур, фіял і шпіляў, высокіх спічастых праёмаў, архітэктар Густаў Шахт здолеў надаць абліччу храма паветраную лёгкасць і вытанчаную графічнасць. Як адзначае беларускі даследчык архітэктуры Анатоль Кулагін, кампактнасць кампазіцыі, графічная штрыхоўка фасадаў дазваляюць прылічыць помнік да нешматлікіх прыкладаў высокай "палымнеючай" готыкі, якая стала, паводле слоў архітэктара А.Бурава, "архітэктурай, што перайшла на той бок свайго матэрыяльнага існавання і падаўляе сваёй бязважкасцю".

Сучаснікі будаўніцтва Сар'янскага касцёла бачылі ў яго формах вялікае стылістычнае падабенства з касцёлам Св.Ганны ў Вільні — дасканалым узорам дойлідства XY стагоддзя. Сапраўды, у аздабленні абодвух храмаў прасочваецца выразнае імкненне аўтараў да падрабнення дэталяў, замілаванне вострымі і спічастымі дэкаратыўнымі формамі, асабліва вылучэнне вертыкаляў праз высокія вежы і завостраныя шпілі. Азначаныя рысы былі ўвогуле ўласцівыя помнікам позняй готыкі і, творча пераасэнсаваныя праз чатыры стагоддзі талентам Г.Шахта, знайшлі сваё ўвасабленне ў рамантычнай узнёсласці новага Сар'янскага касцёла.

Людміла ХМЯЛЬНІЦКАЯ.



НА ЗДЫМКАХ: Марыля ЛАПАЦІНСКАЯ з ШУМСКІХ. Бюст; касцёл у Сар'і. Малюнак Напалеона ОРДЫ.

Працяг.
Пачатак у №№ 16—17.

НАША СЁННЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Я напісала гэта і сама сабе здзівілася. У нас таксама няма цэнзуры, а добрых кніг (новых) няма, бо цяпер усё вырашаюць грошы і не кожная вартая кніга можа выйсці".

Прачытала я гэтыя радкі ў пісьме Марыі Путрамант і задумалася.

А сапраўды, чым жывуць наша літаратура, нашы пісьменнікі сёння? На вялікім гістарычным перавале?

І зрабілася мне сумна.

Праўда, гады два-тры таму назад адчувалася ажыўленне. У вольную ад цэнзуры нішу заспяшаліся некаторыя пісьменнікі, заспяшаліся, быццам баючыся, што гэтую вольную нішу скора зачыняць, і некалькі аповесцяў надрукаваў Сяргей Грахоўскі, больш таго, гулагаўскага жыцця. Надрукавалі сатырычную аповесць А. Мрыя, якая толькі тым часам і змагла ўбачыць свет. З"явіліся новыя нізкі вершаў Алеся Звонака, як заўсёды, яркія апавяданні і аповесці Васіля Быкава, іншыя цікавыя творы,

Гады два-тры таму назад наогул нашу літаратуру, нашу мову быццам асвяжыў вясновы вецер, зачапілася надзея на адраджэнне беларускай культуры, беларуская ідэя, як тое маладое дрэўца пад промнямі цёплага сонца, зазелянела кволымі лісткамі. Пачалі з'яўляцца беларускія школы, беларускія класы ў рускіх школах, беларускія ліцэі...

Калі я бывала ў Польшчы, то заўсёды з прыемнасцю і зайздрасцю ўслухоўвалася ў польскую гаворку. З зайздрасцю таму, што ў Польшчы ўсе, ад прэзідэнта да самага сціплага чыноўніка, гавораць па-польску, па-польску размаўляюць і ў горадзе, і ў вёсцы, старыя і малыя. Было падобна на тое, як казаў некалі класік вуснамі свайго героя -- у Парыжы такая культура, што нават рамізнікі гавораць па-французску.

У нас, у Беларусі, нават рамізнікі размаўляюць па-руску, хаця і страшэнна калечаць гэту мову. Калечаць яе і члены заканадаўчай, выканаўчай улад, слухаць іх -- хоць вушы затыкай, але сваёй, роднай мовы ўжываць не хочуць.

Савецкія русіфікатары загналі беларускую мову пад печ, высокае савецкае начальства беларускую мову ігнаравала, з'явілася нават апраўданне: мова партыі, -- руская мова. А паколькі партыя кіравала ўсім, існавала над усім, то і рускую мову ставілі над мовамі ўсімі, выцяснялі ёю родную.

Дык вось, гады два-тры таму назад, калі Старшынёю Вярхоўнага Савета быў абраны Станіслаў Шушкевіч, мы раптам упершыню за шмат гадоў пачулі нашу мову з высокай трыбуны. І яна пачала ажываць, ужо можна было пачуць яе ў метро, у тралейбусе, на вуліцы, з'явіліся шыльды, хоць і не заўсёды пісьменныя, але напісаныя па-беларуску.

Аднак свята, як правіла, бывае кароткім. Такім кароткім было ў нас і свята Адраджэння. Сёння тое дрэўца -- беларуская ідэя -- пачынае жаўцець, засыхаць, ападаюць ужо яго лісткі, не паспеўшы ўвабрацца ў сілу. Новае начальства павярнула ў нашай клуьтуры на сто восемдзесят градусаў. І рассыпаюцца беларускія класы, пераводзяцца на рускую мову беларускія школы.

Як жа рэагуюць на ўсё гэта беларуская літаратура, беларускія пісьменнікі?

Часопіс "Полымя", люстра беларускай прозы, паэзіі, крытыкі, у якім заўсёды друкавалася лепшае, створанае беларускімі пісьменнікамі, нашмат скараціўся ў аб'ёме. Выдавецтва "Мастацкая літаратура" наогул села на мель, шмат якія кнігі, здадзеныя ў вытворчасць яшчэ ў дзевяноста пятым годзе, дасюль не выйшлі ў свет: і ў нас "усё вырашаюць грошы", як піша мая карэспандэнтка.

І ўсё-такі літаратура жыве, і з'яўляюцца новыя творы, вартыя ўвагі, з'яўляюцца новыя імёны. Як адзначалася ўжо вышэй -- працягвае сваю галоўную тэму Васіль Быкаў. У пятым нумары часопіса "Полымя" за мінулы год ён надрукаваў падборку апавяданняў -- зноў пра вайну, пра чалавека ў ёй, які сваімі няскоранасцю, высакародствам, сумленнасцю ўзнімаецца да вяршынь чалавечага духу, які жыве ў сваім, адзеленым ад навакольнага свеце. У свеце, што за межамі ягонай душы -- шмат подласці і крывадушша, глыбокай несправядлівасці. Герой Васіля Быкава адасоблены ад таго навакольля ўласным сумленнем, уласным поглядам на сваё месца ў гэтым пекле.

Новыя кнігі мініяцюр, поўныя філасофскага роздуму, назірання над навакольным светам, выдаў Янка Брыль.

Віктар Казько ў аповесці "Прахожы" праз вобразы-сімвалы перадае трывожны подых абпаленай Чарнобылем зямлі, перадае імкненне ўратаваць усё жывое, а найперш -- душу чалавека.

Пра сённяшні складаны, сумбурны дзень піша Павел Місько ў нарысе "Дзеці падзямелля".

Верны тэме свайго юнацтва, маладосці Іван Навуменка, зусім нядаўна надрукаваў ён новую аповесць -- "Любімы горад".

Але трэба сказаць, што некаторыя нашы пісьменнікі пад уплывам новых акалічнасцяў паказалі сябе н[illegible] самага лепшага боку. Для [illegible]торых, як высветлілася, страта беларускай ідэі, беларускага Адраджэння не такая вялікая бяда, як страта ўласнага дабрабыту, высокіх ганарараў, сва[illegible] прывілеяванага становішча. [illegible]чайна змагаюцца за права беларусаў "Людзьмі звацца" зноў той жа Васіль Быкаў, Ніл Гілевіч, Рыгор Барадулін, Анатоль Вярцінскі.

Васіль Быкаў змагаецца і мастацкім словам, і публіцыстыкаю, і палкімі прамовамі на мітынгах.

Горача падтрымлівае ідэю Адраджэння Ніл Гілевіч -- і вершамі, і словам публіцыста. У адным з апошніх сваіх артыкулаў ён піша:

"Хоць і вельмі непрыемна гэта гаварыць, але так яно і ёсць: дзяржаўная палітыка, скіраваная на вынішчэнне мовы, а гэта значыць і духоўнай культуры свайго народа -- гэта дзікунства. Толькі дзікуны і манкурты не здольны думаць і клапаціцца пра духоўнае аблічча нацыі, да якое яны самі належаць, пра заўтрашні дзень нацыі, якога ў яе проста не будзе, калі народ пазбавіць яго ўласнай мовы, калі ў душы народа знішчыць жывыя карані і карэньчыкі сваёй уласнай, прыродна-самабытнай духоўнай творчасці".

Безумоўна, падзеі, што адбываюцца ў Беларусі, не могуць не ўплываць на паэзію, на яе вобразнасць. Рыгор Барадулін бачыць Беларусь раскрыжаванаю.

Усявышні,
Хоць крошак зор накрышы,
Разгавей беларусу вячэру.
Згінь, крумкач, не кружы,
Беларусь на крыжы
Уваскрэсне ў пакутах
за веру.

Верш "Беларусь на крыжы".

Некалі, пры савецкай уладзе, зварот да вышэйшай сілы, да Бога быў у беларускай літаратуры не вельмі папулярны, рэдактары проста выкрэслівалі з вершаў, калі там яны траплялісяі, гэтыя ідэалістычныя матывы. Забарона сплыла, і паэты кінуліся ў гэту, цяпер свабодную прастору, яны ўжо там, у не асвоеным раней свеце, шукаюць справядлівасці, з гэтаю сілаю звязваюць сваю надзею. Васіль Зуёнак у вершы "Ойча наш..." піша:

"Ойча наш..." -- ці ў
грымотах дарога,
Ці ў чарнобыльскай
мляўкай цішы, --
"Ойча наш..." --
я прашу толькі ў Бога
Хлеба і ўратавання душы.

Сум, трывога, за якія некалі так моцна судзілі савецкую паэзію, цяпер, можна сказаць, рэдка калі пакідаюць паэтычны радок, хаця не траціцца надзея і на ўваскрашэнне. Той жа Васіль Зуёнак у паэме "Падарожжа вакол двара" піша:

Двор без мамы --
Народ без мовы.
Ды агонь святы не пагас.
Ёсць душа -- будуць
вешчыя словы,
Двор збіраць ме,
зняверaных, нас...

Летась наша паэзія панесла вялікую страту: пайшлі з жыцця Максім Танк і Пімен Панчанка, два вялікія беларускія паэты. А як патрэбна было б сёння іх высокамастацкае і сумленнае слова!

Нягледзячы на неспрыяльную пару для беларускай літаратуры, для нараджэння новых імён, яны ўсё-такі нараджаюцца. Падобна на тое, як у жудасных умовах канцэнтрацыйных лагераў, гулагаў жыло каханне і нараджаліся дзеці.

Апошнім часам шмат гавораць, пішуць пра маладога празаіка Андрэя Федарэнку. Ён неяк па-свойму глянуў на наш дзень, на чалавека ў ім. Ён бачыць страту нечага важнага ў людскіх душах, бачыць гібельны ўплыў асяроддзя і ўсё ж чапляецца за рэшткі светлага, не страчанага ў чалавеку, што схавана глыбока, як зародак у зерні. Дай яму хоць крышку цяпла, увагі, і тое зерне ажыве, прарасце дабром.


Андрэй Федарэнка піша ў традыцыйнай манеры, у такой манеры, як пісалі нашы класікі, і за гэта яго дакараюць іншыя маладыя пісьменнікі, тыя, што шукаюць новых формаў пісьма, выяўлення душы чалавечай. Пошукі -- гэта заўсёды выдатна, але, на мой погляд, пакуль гэта маладая генерацыя нічога новага не знайшла, не адкрыла. У іх творах шмат незразумелых чытачу сімвалаў, а раскаванасць -- пішу што хачу і як хачу -- таксама не заўсёды прыносіць плён.

Уваскрэс у нашы дні і жанр ананімнай паэмы, верша. Такое пішацца ўжо тады, калі аўтару небяспечна сябе абнародаваць, бо можна загрымець і на лаву падсудных. А націск на сродкі масавай інфармацыі ў нас мацнее і мацнее.

Беларуская інтэлігенцыя не хоча папусціцца, стварающа арганізацыі, суполкі ў абарону беларускай мовы, беларускай школы, беларускай культуры, але, на вялікі жаль, яны вельмі мала ўплываюць на працэс, якім кіруе начальства, і асмялелыя ненавіснікі ўсяго беларускага ў вочы здзекуюцца з нашай мовы.

Вядома, мой погляд на сённяшні дзень, на літаратуру апошняга часу і суб'ектыўны, і няпоўны, некаторыя падзеі, творы праходзяць паўзбоч. Але, калі кінуць вось так, беглым вокам, на наш літаратурны працэс, то ясна адно: хоць карабель беларускай ідэі і вельмі хістае, кідае яго з борта на борт, аднак ён змагаецца з хвалямі і плыве, плыве наперад, і трэба спадзявацца, што ніякія падводныя рыфы яго не загубяць, рана ці позна ён прыплыве да сваёй мэты.

Лідзія АРАБЕЙ.



У Мінску ў Рэспубліканскай мастацкай галерэі ў мінулым месяцы адкрылася персанальная выстава Вячаслава Захарынскага. Апошні раз мінчане сустракаліся з творчасцю гэтага мастака каля чатырнаццаці гадоў назад. І з таго часу ён у Беларусі не выстаўляў свае творы. Прайшоўшыя гады былі часам напружанага творчага пошуку, шматлікіх паездак мастака ў Польшчу, Італію, Германію. Але любімая Беларусь заўсёды заставалася радзімай, родным домам. І цяпер створанае за гэтыя 14 гадоў ён і паказвае суайчыннікам.

НА ЗДЫМКУ: на выставе Вячаслава ЗАХАРЫНСКАГА.
Яўген КАЗЮЛЯ.

УСПАМІНАЮЧЫ ПАЭТА ЯЎХІМА КОХАНА

ЯК АСКОЛКІ ПЕКЛА

Распрацоўваючы тэму "Жлобіншчына літаратурная", з задавальненнем у свой час дапоўніў спіс пісьменнікаў, паэтаў, літаратараў, якія нарадзіліся ці мелі нейкае дачыненне да Жлобіншчыны, трыма імёнамі. Гэта Хвядос Шынклер, Васіль Вітка і Яўхім Кохан. У далёкія цяпер 30-я гады гэтыя тады маладыя хлопцы пэўны час жылі ў Жлобіне, дзе выпускалі рэгіянальную чыгуначную газету "Ударнік".

Імя жывога класіка Васіля Віткі сёння ва ўсіх на слыху, не ўзнікла ў мяне праблем са знаёмствам з творчасцю і біяграфічнымі звесткамі і Хвядоса Шынклера, а вось наконт Яўхіма Кохана... Імя гэтага даволі вядомага ў даваенны час рэспубліканскаму чытачу [illegible]та сёння мала што нам гаворыць. Няма аб ім звестак і ў [illegible]ратуразнаўчых даведніках. Давялося весці пошук.

З успамінаў Сяргея Грахоўскага даведаўся, што ў 30-я гады ён добра ведаў Яўхіма Кохана, пэўны час жыў разам з ім у Бабруйску. Па кансультацыю і вырашыў у першую чаргу звярнуцца да Сяргея Іванавіча, адказ ад якога не прымусіў сябе доўга чакаць. Ён пісаў, [illegible] доўгі час падтрымліваў перапіску з Яўхімам Коханам, які пра[illegible]аў у горадзе Багародзіцку Тульскай вобласці, але ўжо некалькі [illegible]д не меў ад яго звестак.

Першы мой ліст у Багародзіцк (лістапад 1994 года), на жаль, вярнуўся назад з прыпіскай на канверце: "Адрасат памёр". А вось другая спроба -- на гэты раз праз Багародзіцкі ЗАГС -- была пасяховай. Высветлілася, што яшчэ жывая жонка пісьменніка -- Марыя Лаўрэнцьеўна. Яна і паведаміла некаторыя даныя жыцця і творчасці свайго мужа, даслала яго рукапісы, фотаздымкі.

Цяпер нам дакладна вядома, што Яўхім Іванавіч Коханаў (Кохан) нарадзіўся 3 лютага 1912 года, памёр -- 23 лютага 1993 года. Думаю, шырокаму колу чытачоў будуць цікавыя і такія факты. Нарадзіўся Яўхім Кохан у сялянскай сям'і на Случчыне. "...Каб расказаць усё пераэкытае ім хаця б у асноўных падзеях, -- піша ў сваіх успамінах "На скрыжаванні маланак" (1972 год) Васіль Вітка, -- гэта была б цэлая эпапея -- невыносна цяжкая, пакутная і захапляючая, як лёс многіх людзей, якім на саміх сабе прыйшлося выпрабаваць самыя крутыя і бязлітасныя павароты гісторыі". Далей Васіль Вітка адзначае, што самабытны талент паэта Яўхіма Кохана першым заўважыў не хто іншы, як сам Кузьма Чорны. Актыўна друкавацца паэт пачаў у канцы 20-х, але так і не сабраў і не выдаў ніводнай сваёй кніжкі. Жыццё ж паэт "спазнаў дасканала", працаваў цесляром, сталяром, начным вартаўніком, малатабойцам, пажарнікам, паштавіком, журналістам, архівістам...

З першых дзён вайны Яўхім Кохан -- на фронце. Ваяваў пад Харкавам, Сталінградам, на Курскай дузе. Закончыў вайну ў Сілезіі камандзірам, быў узнагароджаны многімі баявымі ордэнамі і медалямі. Пасля вайны паэт на працягу дваццаці пяці год працуе начальнікам паштовага вагона. Аб'ездзіў усе чыгуначныя лініі ад Львова да Уладзівастока.

У сваіх успамінах Сяргей Грахоўскі ў адказе на мой ліст пісаў: "Таленавітым паэтам ён быў бясспрэчна, але ў рэпрэс[illegible]ны час ён вымушаны быў туляцца па краіне, каб не трапіць у Сібір, і літаратурны лёс яго не склаўся. Мы з ім і з Віткам у 1930--1931 гады разам жылі ў адной кватэры ў Бабруйску, некаторы час разам з ім кватараваў у Мінску, потым ён нечакана з'ехаў у невядомасць. Азваўся толькі ў 60-я гады. Аднойчы мелькам бачыліся, доўгі час перапісваліся. Жыў ён у Львове, закончыў завочна Маскоўскі гісторыка-архіўны інстытут, прайшоў усю вайну. Часам друкаваўся ў "Маладосці", у "Днях паэзіі", у "ЛіМе"...

А вось што дадае ўжо Марыя Лаўрэнцьеўна: "Ажаніўся паэт у 1938 годзе, з першых дзён вайны -- на фронце. Пасля дэмабілізацыі ў 1946 годзе мы пераехалі ў Львоў, з 1969 года -- у Багародзіцку". Як сведчыць гэтая 86-гадовая жанчына, муж яе пры жыцці шмат пісаў. Сама ж Марыя Лаўрэнцьеўна сёння засталася адна. Адзіная іх дачка памерла даўно ў час родаў.

... Рыхтуючы гэты артыкул для "Голасу Радзімы", я спадзяюся, што на яго адгукнуцца тыя, хто ведаў Яўхіма Кохана па яго жыцці за межамі Беларусі. Просьба пісаць на адрас: **247210, Беларусь, Гомельская вобласць, горад Жлобін, 2 мікраараён, дом 9, кватэра 120. Шуканаву Мікалаю.**

Мікалай ШУКАНАЎ.

З рукапіснай спадчыны Яўхіма Кохана

АПОШНІ ВЕРШ

Я мноства ўласных вершаў склаў
За мноства год свайго жыцця --
Бліскочуць, як асколкі пекла,
З саміх глыбінь сэрца-быцця.

НАЛЕЖАЦЬ І НАШАЙ ГІСТОРЫІ

КАНДРАТ КАРСАЛІН

У 60-я гады мінулага стагоддзя Пецярбургская акадэмія мастацтваў, збіраючы звесткі аб найбольш вядомых сваіх сябрах, звярнулася да акадэміка жывапісу К.Карсаліна з прапановай адказаць на некалькі пытанняў, якія датычылі яго жыцця і творчасці. Кандрат Карсалін быў вельмі сціплым чалавекам, і яго адказы вылучаліся лаканізмам. Але за скупымі радкамі хаваўся незвычайны лёс. Здарылася так, што жыццё кідала Карсаліна з адной часткі свету ў другую, майстэрняй яму служылі два кантыненты, а яго творчая манера ўвабрала ў сябе цалкам непадобныя мастацкія традыцыі.

"Нарадзіўся я ў 1809 годзе 9 сакавіка ў горадзе Слуцку Мінскай губерні, бацькі мае былі мяшчане таго ж горада праваслаўнага веравызнання, бацька Ілля Сямёнавіч і маці Таццяна Якімаўна", -- пісаў Карсалін. Слуцк у той час быў невялікім мястэчкам, налічваў каля трох тысяч чалавек. Гэта быў горад рамеснікаў і дробных гандляроў, дзе не было брукаваных вуліц, затое меліся шматлікія агароды і папасы. "Выхаваннем я абмежаваўся хатнім, якое мог атрымаць пры недастатковасці сродкаў бацькоў маіх. Па мастацтву ж, пачаўшы з 12-гадовага ўзросту самавукам пісаць абразы, я з 14-ці гадоў займаўся работай для іканастасаў у розных нязначных па майстэрству жывапісцаў, але не вучнем, а ў якасці памочніка і не мог узяць у іх нічога для далейшага развіцця майго ў мастацтве, а дапамаглі мне ў гэтым капіраванне з больш значных па мастацтву твораў ды асабісты густ, па партрэтным жывапісу я карыстаўся некаторымі парадамі настаўніка малюнка пры слуцкай гімназіі мастака Геса".

Не маючы пачатковай адукацыі, а таксама сродкаў на далейшае навучанне, Карсалін не мог у той час марыць не толькі аб вучобе ў Пецярбургскай акадэміі мастацтваў, але нават аб Віленскай мастацкай школе -- факультэце ў Віленскім універсітэце, дзе можна было тады выхадцу з Беларусі атрымаць вышэйшую адукацыю. Тамаш Гес, парадамі якога карыстаўся малады мастак, быў выхаванцам Віленскага універсітэта і, пэўна, многа апавядаў Карсаліну пра вучобу ў Вільні. Гес быў вельмі добрым партрэтыстам. Па ўспамінах сучаснікаў, ён вызначаўся асаблівай здольнасцю дакладна перадаваць воблік мадэлі па памяці, не робячы папярэдніх эскізаў, аднолькава добра працаваў алеем, вугалем, пяром і пастэллю. Тамаш Гес шмат чаму навучыў Карсаліна.

У 1830-я гады Карсалін пераехаў у Арол, дзе жыў за кошт свайго мастацтва, малюючы іконы і партрэты мясцовых чыноўнікаў і мяшчан. У гэты час лёс усміхнуўся маладому мастаку. У 1837 годзе праездам на Украіну ў Арле спыніўся канферэнц-сакратар Пецярбургскай акадэміі мастацтваў Грыгаровіч. Ён, убачыўшы работы Карсаліна, даў яму рэкамендацыю для паступлення ў сталічную акадэмію. Праз год Карсалін быў ужо вольным слухачом Акадэміі мастацтваў.

Жыццё ў сталіцы было надзвычай дарагім. Зямляк Карсаліна, таксама вучань акадэміі Вікенцій Смакоўскі, некалі падлічыў, што на год студэнту акадэміі патрэбна прыкладна 2 800 рублёў, каб не толькі прыстойна жыць, але набыць фарбы, палатно і іншыя матэрыялы для работы. Стыпендыя, якую атрымлівалі студэнты, складала ўсяго 200 рублёў у год. Таму Кандрат Карсалін вымушаны быў звярнуцца па дапамогу да ўладаў. Ужо на першым курсе акадэміі ён праявіў выдатныя здольнасці: выкладчыкі адзначалі, што малады мастак "вельмі добра малюе партрэты з натуры і пры гэтым выразна схоплівае падабенства". Аргументам, які б заахвоціў улады выдзеліць маладому мастаку грашовую дапамогу, павінен быў з'явіцца партрэт Мікалая І -- мініяцюра, зробленая Карсаліным з работы Кругера і прапанаваная ім цару. Але, нягледзячы на станоўчыя водгукі выкладчыкаў акадэміі, мініяцюра не была куплена Мікалаем. Карсалін жа так і не атрымаў грошай.

Аб месяцах, праведзеных мастаком у сценах Акадэміі мастацтваў, вядома мала. Як сведчаць дакументы, Кандрат Карсалін у гэты час быў знаёмы з Шаўчэнкам, з якім разам дабіваўся ў мясцовай паліцыі дазволу на жыццё ў Пецярбургу. Мастак-беларус многа працаваў, галоўным чынам, у жанры партрэта. У ліпені 1839 года ён прадставіў у Савет акадэміі дзве свае работы: "Аўтапартрэт" і "Партрэт мужчыны" -- на атрыманне звання некласнага мастака. Конкурс прайшоў паспяхова. Званне некласнага мастака было самай нізкай прыступкай на лесвіцы мастацкай іерархіі, але яно давала права мастаку з непрывілеяваных саслоўяў жыць у любым месцы Расійскай імперыі без пашпарта.

На далейшую вучобу ў Акадэміі мастацтваў у Карсаліна не было сродкаў. Трэба было шукаць работу. Савет Акадэміі мастацтваў прапанаваў маладому мастаку месца ў складзе Рускай духоўнай місіі ў Пекіне. Гэтае прызначэнне вырашала самую складаную для Карсаліна праблему -- праблему грошай. На працягу 12 гадоў мастак павінен быў знаходзіцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні, атрымліваючы акрамя гэтага 500 рублёў заработку. Пасля заканчэння службы ён павінен быў атрымаць значную пенсію. Акрамя таго, стваралася выдатная магчымасць паглядзець на далёкія краіны, пазнаць свет і новых людзей. Карсалін згадзіўся.

Руская праваслаўная місія ў Кітаі існавала з 1729 года, яе мэтай было распаўсюджванне хрысціянства пераважна сярод албазінцаў -- патомкаў рускіх палонных з крэпасці Албазін на Амуры, паселеных некалі ў Пекіне. З 1807 па 1821 год яе ўзначальваў Іакінф Бічурын -- выдатны кітаязнавец, гісторык і этнограф, работы якога паклалі пачатак глыбокаму і шматбаковаму вывучэнню гісторыі і культуры кітайскага народа і народаў Цэнтральнай Азіі. Пад яго кіраўніцтвам сябры місіі пачалі не толькі распаўсюджваць праваслаўе, але заняліся сур'ёзнымі навуковымі даследаваннямі. Такая дзейнасць не спадабалася Сіноду. Бічурын быў вызвалены ад кіраўніцтва і сасланы ў адзін з манастыроў у Расіі. У 1826 годзе ён быў пераведзены ў Аляксандра-Неўскую лаўру і прыкамандзіраваны да Міністэрства замежных спраў у якасці перакладчыка і настаўніка кітайскай мовы. Бічурын быў нядрэнным спецыялістам у галіне кітайскага жывапісу, нават апублікаваў на гэтую тэму артыкул у адным з часопісаў. Хутчэй за ўсё, менавіта Іакінф Бічурын быў настаўнікам Кандрата Карсаліна, які на працягу некалькіх месяцаў вывучаў пры Азіяцкім дэпартаменце Міністэрства замежных спраў кітайскую мову.

Служба пры місіі патрабавала ад мастака асобых якасцей. У інструкцыі, якую даў Карсаліну прэзідэнт Акадэміі мастацтваў А.Аленін, была вызначана вялікая і разнастайная праграма. Галоўнае, што патрабавалася, -- рабіць дакладныя замалёўкі. "Вы павінны замалёўваць натуру такой, якая яна ёсць і якой яна вам сустрэнецца, а не так, як яна можа быць прыгожай і дасканалай", -- пісаў Аленін. Акрамя таго, пасля прыезду ў Кітай мастак павінен быў навучыцца спосабам прыгатавання кітайскіх фарбаў і тушы, а таксама авалодаць тэхнікай кітайскага жывапісу. У выкананні гэтага задання мастаку павінна была дапамагчы школа, пройдзеная ім у юнацтве ў мастака Геса: Карсалін, як і яго настаўнік, добра валодаў рознымі матэрыяламі для жывапісу і малюнка. Улічваючы недаверлівыя адносіны кітайцаў да рускіх, мастак павінен быў праявіць дыпламатычныя здольнасці, каб не выклікаць падазрэнняў сваімі заняткамі.

У складзе Рускай місіі Карсалін пазнаёміўся з чалавекам, імя якога стала сёння сімвалам руска-японскай дружбы -- Іосіфам Гашкевічам, беларусам з ваколіц Рэчыцы. Іосіф Гашкевіч ехаў у Пекін як дыпламат і вучоны. Сёння невядома, ці былі блізкімі сябрамі ў той час гэтыя два беларусы, якія адкрывалі Расіі экзатычны Кітай. Усё гаворыць за тое, што Гашкевіч і Карсалін павінны былі пасябраваць. Абодва паходзілі з небагатых сем'яў і самі пракладвалі сабе шлях у жыццё. Яны былі беларусамі, што было, бадай, галоўным аргументам на карысць іх сяброўства. Гашкевіч, як і Карсалін, захапляўся мастацтвам. Пазней ён надрукаваў некалькі артыкулаў аб тэхніцы кітайскага жывапісу. Акрамя таго, функцыі, якія абодва павінны былі выконваць у Пекіне, былі падобнымі. Гашкевіч вёз у Кітай фатаграфічны апарат, каб рабіць здымкі найбольш цікавых архітэктурных пабудоў і краявідаў. На жаль, пакуль што не знойдзена пісьмовых крыніц, [illegible] пралівалі б святло на аднос[illegible]ашкевіча і Карсаліна ў час [illegible] службы ў Кітаі.

Праваслаўная місія выехала ў Кітай у снежні 1839 года. Шлях яе цягнуўся праз [illegible] імперыю да Кяхты. А адтуль [illegible]ядомаму "Гарбатнаму шляху" да Пекіна. У дарозе Карсалін рабіў замалёўкі ў дзённік прыстава Любімава (які ехаў разам з місіяй) сустрэчных людзей розных нацыянальнасцей, а таксама прадметаў побыту, касцюмаў, раслін і жывёл.

Якім убачыў Карсалін Кітай, адбыўшы доўгае падарожжа, можна ўявіць, гартаючы дзённікі В.Кавалеўскага, нашага земляка, навукоўца і падарожніка, які быў у складзе місіі за некалькі год да Карсаліна. Ён піша аб Пекіне: "Побач з пышнымі, упрыгожанымі золатам пабудовамі стаяць халупы, логавішча бедных. За калясніцай багатага вяльможы, абкружанага аршакам добра апранутых вершнікаў, цягнуцца тлумы бяздольных жабракоў, абарваныя, з калтуном у валасах, пакрытыя балячкамі і брудам". Галеча, у якой жыў кітайскі народ, уражвала нават прыехаўшых з прыгоннай Расіі падарожнікаў.

У Пекіне Карсалін прабыў каля трох год. Ён многа працаваў: пісаў партрэты кітайскіх вяльмож, прыватных асоб, рабіў накіды мясцовых краявідаў. У альбоме мастака з'явіўся ў гэты час эскіз адной з яго найбольш вядомых работ "Від на загарадны палац у ваколіцах Пекіна", якая паказвала рэзідэнцыю кітайскага багдыхана Ван Шэу Шаня.

У 1843 годзе Карсалін вымушаны быў пакінуць місію. Цяжкая хвароба, хутчэй за ўсё, малярыя, якую вельмі дрэнна пераносілі прыехаўшыя ў Кітай еўрапейцы, зрабіла немагчымым далейшае знаходжанне мастака ў Пекіне. Ён накіроўваецца ў Іркуцк.

Аб дзесяцігоддзі, праведзеным Карсаліным у Сібіры, вядома няшмат. У аўтабіяграфіі сярод галоўных сваіх прац мастак называе напісаную ім у Іркуцку карціну "з 25 асоб партрэтаў паноў правазнаўцаў, якія складалі рэвізійную камісію ў Сібіры ў 1844--1845 гадах пад кіраўніцтвам сенатара І.М.Талстога". Мастак зрабіў тады вялікую працу, выканаўшы, акрамя групавога партрэта з 25 постацей у поўны рост, 21 партрэт-мініяцюру гэтых чыноўнікаў. Магчыма, Карсалін, нягледзячы на забароны, што існавалі ў той час, зрабіў некалькі партрэтаў-мініяцюр дзекабрыстаў ці іх родных, якія ў той час былі пераведзены на пасяленне ў Іркуцк і яго наваколле. Дарэчы, з дзекабрыстамі ў свой час быў звязаны Іакінф Бічурын, аб якім ужо згадвалася вышэй. Магчыма, некаторыя з партрэтаў-мініяцюр, аўтарства якіх сёння не ўстаноўлена дзекабрыстазнаўцамі, належаць пэндзлю нашага земляка. Не выклікае сумнення, што, калі нават Карсалін і не маляваў дзекабрыстаў, ён павінен быў пазнаёміцца з імі ў невялікім па колькасці насельніцтва Іркуцку.

У Пецярбург Карсалін вярнуўся на пачатку 50-х гадоў. Ён вярнуўся ўжо сталым майстрам, які меў за плячыма тры дзесяцігоддзі напружанай творчай працы. Мастак пачаў рыхтавацца да конкурсу на званне акадэміка партрэтнага жывапісу. У якасці мадэлі для конкурснай работы яму згадзіўся пазіраваць протапрэсвітэр расійскага флоту Кутневіч.

(Заканчэнне на 8-й стар.).

ТАНЦУЮЦЬ "КАРУНАЧКІ"






Дзесяць гадоў пры Жабінкаўскім гарадскім Доме культуры існуе дзіцячы ўзорны танцавальны ансамбль "Карунечкі" -- удзельнік многіх фальклорных фестываляў Брэстчыны. Семдзесят хлопчыкаў і дзяўчынак асноўнага складу і трыццаць дзяцей з 3 да 5 гадоў у падрыхтоўчай групе -- такі склад ансамбля. А танцуюць "Каруначкі" і вядомыя ва ўсёй Беларусі, і ўласцівыя толькі свайму рэгіёну танцы.

НА ЗДЫМКАХ: кіруе ансамблем выпускніца Гродзенскага культасветвучылішча, у мінулым сама ўдзельніца дзіцячага танцавальнага ансамбля "Лялькі" з Баранавіч Ірына РУМКО (у цэнтры); танцуюць "Каруначкі".

Фота Рамана КАБЯКА.

ВЯСЕННІ РЭПАРТАЖ







Беларуская прырода стала такой жа непрадказальнай і капрызлівай, як і само наша жыццё. Толькі што мы перажылі цяжкую, суровую, незвычайна марозную і снежную зіму. Літаральна два тыдні таму на палях і ў лесе ляжалі гурбы снегу (у лагчынах і зацямнёных месцах белыя прахалодныя плямы дзе-нідзе можна ўбачыць і зараз), а на Радаўніцу, 23 красавіка, слупок тэрмометра хутка папоўз угару і дасягнуў + 26 градусаў. Нязвыклае, нечаканае так хутка цяпло бянтэжыць, да яго цяжка прыстасавацца, па звычцы людзі цёпла апранаюцца і пакутуюць ад незвычайнай гарачыні.

Вабнае вясновае сонца афарбоўвае з'явы і прадметы ў святочныя яркія тоны і стварае такі ж святочны настрой. Дрэвы толькі прачынаюцца, дзе-нідзе на бярозах з'яўляюцца кволыя зялёныя лісточкі, затое пышны дзьмухавец нагадвае вярба, якая распусцілася лёгкімі жоўтымі "коцікамі", струменіць мядовы водар, прываблівяючы пчол, чмялёў і матылёў, што роем круцяцца вакол дрэва.

Такая раптоўная змена надвор'я радуе, але і насцярожвае: для нашай умеранай паласы гэта не зусім натуральна, а старыя людзі скрушна ківаюць галовамі, прадказваючы засушлівае спякотнае лета.



Пакуль што цяплу рады ўсе: дзеці і дарослыя, мастакі, якія вынеслі да гледачоў і пакупнікоў свае работы, і бесклапотныя маладыя дзяўчаты, якім ёсць што расказаць адна адной.

Вясенні рэпартаж зняў фотакарэспандэнт Віктар СТАВЕР.

СПОРТ

СПАРТЫЎНАЯ ГІМНАСТЫКА. У Пуэрта-Рыка прайшло першынство свету ў асобных практыкаваннях. Беларускія гімнасты выставілі самы моцны састаў. Найбольш удала на гэтых спаборніцтвах выступіў шматразовы алімпійскі чэмпіён Віталь Шчэрба, які заваяваў "золата" (вольныя практыкаванні), "серабро" (брусы) і "бронзу" (перакладзіна).

Сярод жанчын толькі Алена Піскун вярнулася дадому з "золатам" – першае месца на брусах.

ХАКЕЙ. Зборная Беларусі на чэмпіянаце свету, якое прайшло ў Швейцарыі, заняла трэцяе месца ў групе "Б". Гэта прынесла ёй бронзавыя ўзнагароды, але не дало магчымасці выйсці ў вышэйшую лігу. Адну вакантную пуцёўку тут заваявалі хакеісты Латвіі.

МАРАФОН. Алена Мазоўка з Гродна на міжнародных спаборніцтвах у Лондане ў прызёры не трапіла. І тым не менш выступіла маладая спартсменка ўдала: увайшла ў дзесятку лепшых і была спецыяльна запрошана на марафон, які па традыцыі пройдзе праз год.

ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА. Іспанія прымала ўдзельнікаў турніру Кубка Еўропы. Жаночая зборная нашай рэспублікі ў складзе Валянціны Цыбульскай, Вольгі Кардапольцавай і Леанарды Юхневіч заняла трэцяе месца ў хадзьбе на 10 кіламетраў

ФУТБОЛ. Стартаваў нацыянальны чэмпіянат Рэспублікі Беларусь. Стопрацэнтнага поспеху ў першых двух турах дамагліся мінскія "Дынама", "Атака-Аура" і мазырскі МПКЦ.

Дынамаўцы і мазыране рыхтуюцца да еўрапейскіх кубкавых сустрэч. Да таго ж хутчэй за ўсё з тройкі лідэраў чэмпіянату рэспублікі ў нацыянальную каманду Беларусі трапіць найбольшая колькасць ігракоў, якія правядуць сёлета адборачныя гульні першынства свету.

КАНДРАТ КАРСАЛІН

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.).

Дарэчы, лёс павінен быў зноў звесці разам землякоў і паплечнікаў па Рускай праваслаўнай місіі -- Іосіф Гашкевіч рыхтаваўся ў гэты час да адплыцця на фрэгаце "Палада" ў Японію. Карсалін пабываў у Азіяцкім дэпартаменце, дзе працаваў тады Гашкевіч, маглі яны сустрэцца і ў Адміралцействе, куды наведваўся мастак. Да таго ж Акадэмія мастацтваў і Міністэрства замежных спраў стаяць вельмі блізка – толькі што па розныя бакі Нявы.

У 1854 годзе за партрэт Кутневіча Карсалін атрымаў доўгачаканае званне акадэміка. Але яно не магло забяспечыць матэрыяльна. Мастак, нягледзячы на дрэнны стан здароўя, вымушаны быў многа працаваць. У 1854--1867 гадах ён выконвае шматлікія заказы, перш за ўсё -- піша іконы. Геаграфія такіх заказаў уражвае. У 1859 ці 1860 годзе Карсалін выканаў два абразы для толькі што пабудаванай царквы пры рускім консульстве на востраве Хакадатэ ў Японіі, дзе консулам быў І.Гашкевіч. Гэта былі "Дзяцінства Хрыста" і "Узнясенне Господне". У 1861--1862 гадах для ўпрыгажэння Кафедральнага сабора ў Варшаве Карсалін напісаў "Рыгора Дваяслова". Акрамя таго ў розныя гады ён выканаў абразы для крапаснай царквы ў Дынабургу (сёння -- Даўгаўпілс у Латвіі), некалькі ікон для праваслаўнай царквы ў малдаўскім мястэчку Ліпканы, іконы для цэркваў у Пецярбургу. Над адным з заказаў -- іканастасам для Елецкага палка, у каторы ўваходзіла 11 ікон, мастак працаваў тры гады, выканаўшы не толькі жывапісныя работы, але таксама ўсю пазалоту іканастаса.

Сярод работ Карсаліна шмат карцін на біблейскія сюжэты і ікон. Але ён быў перш за ўсё таленавітым партрэтыстам. Нам невядомы ўсе партрэты, зробленыя мастаком. У спісе сваіх работ ён называе толькі некаторыя, а астатнія значацца пад агульнай назвай "партрэты прыватных асоб". Сярод беларускіх мастацтвазнаўцаў пакуль што ацэнку творчасці Карсаліна даў толькі М.Кацар, які адзначыў, што партрэты пэндзля Кандрата Карсаліна ўражваюць глыбінёй характарыстыкі тыпажу, завершанасцю кампазіцыі, жыццёвай праўдай. Карсалін творча перапрацоўваў і паспяхова выкарыстоўваў розныя мастацкія традыцыі. У яго творчасці можна ўбачыць своеасаблівы сінтэз беларускага мастацтва XYII--XYIII стагоддзяў, рускай акадэмічнай школы і лаканічнага і тонкага кітайскага жывапісу.

Бесперапынная напружаная праца і цяжкія матэрыяльныя ўмовы пагоршылі стан здароўя мастака. "...здароўе маё ўсё больш і больш слабае, – пісаў Карсалін у 1867 годзе, -- асабліва зрок, так што жывапісная праца для мяне становіцца немагчымай". Цяжка было пракарміцца і за кошт урокаў, якія на працягу некалькіх год даваў мастак прыватным асобам і вучням вучылішча пры інструментальным заводзе на Аптэкарскім востраве. Не адбыўшы да канца тэрмін працы ў Рускай місіі, мастак згубіў права на дзяржаўную пенсію. Не маючы сям'і, даўно згубіўшы сувязь з крэўнымі на радзіме, Карсалін не мог разлічваць на чыю-небудзь падтрымку. Ён пачаў хадайнічаць аб пенсіі за 30-гадовую працу і ўрэшце атрымаў – 200 рублёў у год – суму, якая выдавалася стыпендыяту акадэміі, які вучыўся на першым курсе на дзяржаўны кошт.


Памёр Кандрат Карсалін у 1872 годзе ў Пецярбургу.

Сціплы і сумленны пры жыцці, Кандрат Карсалін і пасля смерці застаецца неяк не заўважаным у свеце мастацтва. Імя гэтага мастака, які адкрыў для японцаў рускі іканапіс, першы з беларускіх жывапісцаў маляваў Кітай, акадэміка мастацтва, не значыцца ні ў адной беларускай энцыклапедыі. Некалі ў адным з сваіх лістоў Кандрат Карсалін напісаў: "Я пакінуў сваю Бацькаўшчыну, пэўна, назаўсёды..." Ці не аказалася гэта так на самай справе?

С. СЯЛЬВЕРСТАВА-КУЛЬ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

Рэдактар Вацлаў МАЦКЕВІЧ

ЗАСНАВАЛЬНІК:
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом (таварыства "Радзіма").



НАШ АДРАС:
220005, МІНСК, ПРАСПЕКТ Ф. СКАРЫНЫ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Пазіцыя рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", не заўсёды супадаюць.

Газета набрана і звярстана ў камп'ютэрным цэнтры рэдакцыі газеты "Вечерний Минск". Аддрукавана ў друкарні "Беларускі Дом друку". (220041, г. Мінск, пр. Скарыны,77). Тыраж 3 000 экз. Індэкс 63854. Зак. 454. Падпісана да друку 29. 4. 1996 г.